Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неыскарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: Іншагародніх — 20 к. Мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпаровай пасьля тэксту — р. 30 к. За радок нашпаровай наперад тэксту 1 р. — к. За радок нашпаровай перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазвалены. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 25 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 223 (2411) Чацьвер, 27-га верасьня 1928 г.

Апошнія „дасягненьні" разброеньня.

У РЭЗАЛЮЦЫІ 3-Е КАМІСІІ ЛІГІ НАЦЫЙ ЗУСІМ АБМІНАЕЦЦА ПЫТАНЬНЕ АБ СКЛІКУ ЎСЕАГУЛЬНАЕ КАНФЭРЭНЦЫІ АБ РАЗБРОЕНЬНІ. НЯМЕЦКАЯ І ВЭНГЕРСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫІ ЎСТРЫМАЛІСЯ АД ГАЛАСАВАНЬНЯ РЭЗАЛЮЦЫІ БОНКУРА.

ЖЭНЕВА,-26-IX. Абмеркаваньне рэзалюцыі Поля Бонкура наконт скліку падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні адчынілася дакладам Бэнеша, які тлумачыў адсутнасьць у рэзалюцыі цьвёрдага зазначэньня на час скліку падрыхтоўчае камісіі тым, што «пленум ня мае права даваць такія зазначэньні камісіі, бо ў яе ўваходзяць таксама і дзяржавы, якія ня лічацца сябрамі Лігі Нацый». Далей Бэнеш заяўляў, што сучасное агульнае палітычнае становішча «спрыяе ажыцьцяўленьню першага этапу скарачэньня ўзброеньняў», і што падрыхтоўчая камісія на бліжэйшай сэсіі «палічыць, як відаць, метадным паведаміць раду Лігі Нацый аб магчымасьцях і часе скліку першае ўсеагульнае канфэрэнцыі аб разброеньні».

Вэнгерскі дэлегат Танчос заявіў, што вэнгерская дэлегацыя ўстрымаецца ад галасаваньня, жадаючы зьвярнуць увагу на «нецярпімасьць абразьлівага становішча аднабаковага разброеньня» пераможаных краёў. Разам з тым, Танчос зазначыў, што рэзалюцыя Поля Бонкура ня мае «ні абяцаньня склікаць канфэрэнцыю аб разброеньні, ні нават намёку на яе».

Выступіўшы потым старшыня нямецкае дэлегацыі Бэрнсдорф супярэчыў проці «тэндэнцыі тлумачыць павольнасьць жэнеўскае працы ў галіне разброеньня нявоўным, нібыта, ажыцьцяўленьнем Нямеччынаю не абавязацельстваў аб разброеньні». Бэрнсдорф падкрэсьліваў, што вайсковая арганізацыя Нямеччыны адпавядае пастановам Версальскага ўгавору і што «цяжка абярнуць сьпешна мірную прамысловасьць у вайсковую».

Нарэшце Бэрнсдорф заявіў: „Нішто так не павялічыць бязапаснасьць, як разброеньне. Нямеччына ня хоча перашкаджаць дыпляматычным перамовам, але лічыць, што падрыхтоўчая камісія павінна не рэгістраваць, а стараць згоды. Ігнаруючы склік канфэрэнцыі аб разброеньні і высоўваючы на першы плян дыпляматычныя перамовы, рэзалюцыя азначае крок назад. Можна зьмяніць парадак працы падрыхтоўчае камісіі, каб палітычныя выступленьні не перашкаджалі яе працы; можна перадаць асобныя пытаньні ў марскую падкамісію. Нямеччына гатова лёйяльна ўдзельнічаць у працы Лігі Нацый аб разброеньні, ня высоўваючы перабольшаных патрабаваньняў. Нямецкая дэлегацыя ўстрымліваецца ад галасаваньня, каб не зьмяншаць значнасьці таго нямногага станоўчага, што ёсьць у рэзалюцыі».

Пасьля Бэрнсдорфа выступіў ангельскі намесьнік міністра замежных спраў сэр Лёкер Лемпсон, які даводзіў, што „расчараваньне некаторых колаў працаю Лігі Нацый аб разброеньні тлумачыцца, магчыма, тым што Ліга жадала вельмі паскорыць тэмп гэтае працы». Нарэшце Лёкер Лемпсон зазначыў, што ангельскі ўрад „проці свайго пераконаньня" згадзіўся на рэзалюцыю з напамінаньнем аб часе скліку падрыхтоўчае камісіі, каб не парушыць адназгодненасьці, і з гэтае прычыны выказвае жаль аб нязгодзе з рэзалюцыяй некаторых дэлегацый, дамаганьні якіх аб скліку канфэрэнцыі аб разброеньні ён рашуча адхіляе".

З вялікаю прамоваю выступіў Поль Бонкур, які паўтараў звычайныя довады аб узаемазалежнасьці між разброеньнем і забясьпечэньнем бязапаснасьці. Поль Бонкур вробіў падрабязны агляд працы Лігі Нацый па пытаньнях аб разброеньні і бязапаснасьці; спыняючыся пры гэтым на самых пазначных падрабязнасьцях усіх сэсій падрыхтоўчае камісіі, Поль Бонкур зусім не намінуў пра савецкія праэкты разброеньня.

Пасьля спрэчак рэзалюцыя была ўхвалена адназгодна пры ўстрыманьні нямецкае і вэнгерскае дэлегацый.

Францускае „адхіленьне" неадхільнага.

Водгукі на выкрыцьці „Красной Звезды".

ПАРЫЖ. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Аўтарытэтныя колы абвяшчаюць зусім фальшывымі і пазбаўленымі ўсякае падставы паведамленьні „Красной Звезды", водгук якіх англа-француская марская згода мае 7 асобных згод".

«ФОРВЭРТС» І ТУТ СТАНОВІЦЦА Ў ПРОЦІСАВЕЦКУЮ ПОЗУ.

БЭРЛІН. Абмяркоўваючы выкрыцьці „Красной Звезды" наконт англа-францускае згоды, „Форвэртс" заяўляе: „Калі-б завярэньні „Красной Звезды" былі правільнымі, дык справа ішла-б аб вялікай палітычнай сэнсацыі апошніх гадоў. Аднак, зьмешчанае вельмі пахожа на дагадкі, мэта якіх—распаліць грамадзкую думку Амэрыкі, Італіі, Нямеччыны і СССР проці Англіі і Францыі. Бясспрэчна, што асобныя выкрыцьці вельмі праўдападобны, асабліва ў зьвязку з адкрытым падтрыманьнем Францыі Англіяй у Жэневе.

ВОДГУКІ НА ВЫКРЫЦЬЦІ Ў ЯПОНІІ.

ТОКІЁ, 25-9. Увесь друк агаласіў зьмест англа-францускае згоды, выкрытае „Красной Звездой". Газэта «Ніці-Ніці» заяўляе, што англа-француская згода даказала поўны правал ангельскае дыпляматыі, бо дае магчымасьць амэрыканскім мілітарыстам павялічыць марскія ўзброеньні.

АНГЕЛЬСКАЯ ПРЭСА ТАКСАМА „АДХІЛЯЕ".

ЛЁНДАН, Газэты зьмяшчаюць выняткі з «Красной Звезды». „Дэйлі Экспрэс", называючы выкрыцьці „нячуванаю байкаю", адначасна ганьбіць ангельскае міністэрства замежных спраў за ўтойваньне фактаў.

РАЗГРОМ ЛЕВАГА ЛАТВІЙСКАГА ПРАФРУХУ.

РЫГА, 22-9. Лібаўскі акруговы суд ухваліў зачыніць куляндзкае цэнтральнае бюро (левых) і 6 прафсаюзаў, якія ў яго ўваходзілі, а таксама піанэрскую арганізацыю ў Латвіі.

ПЕРШЫ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПРАФСАЮЗ У АМЭРЫЦЫ.

НЬЮ-ЁРК, 24-IX. Канфэрэнцыя левага крыла тэкстыльшчыкаў, скліканая ў Нью-Ёрку камітэтам рэвалюцыйных тэкстыльшчыкаў, ухваліла заснаваць новы прафэсыянальны саюз, назваўшы яго «нацыянальным саюзам тэкстыльных рабочых".

На канфэрэнцыі прысутнічае 169 дэлегатаў ад 18-ці тысяч арганізаваных тэкстыльшчыкаў, занятых на прадпрыёмствах, дзе працуе больш 130-ці тысяч тэкстыльшчыкаў, неарганізаваных у прафсаюзы.

БЭЛЬГІЙСКАЯ КАМПАРТЫЯ—МАСАВАЯ ПАРТЫЯ

ПАРЫЖ, 20-IX. З Брусэлю паведамляюць, што на сэнатарскіх дадатковых выбарах у Генцкай акрузе сьпіс камуністычнае партыі сабраў 10.324 галасы. Між тым, у часе выбараў 1925 г. кампартыя мела ў гэтым самым раёне 1.084 галасы. Перамогу кампартыі прымушаны прызнаць і сацыялісты.

Урачыстасьць цанкоўшчыны.

ВЕНА, 25-9. Водлуг паведамленьняў баўгарскіх газэт, паліцыя, нібы, выкрыла нелегальную канфэрэнцыю кампартыі і арыштавала 40 чалавек, якія будуць аддадзены пад суд па абвінавачаньні ў парушэньні закону аб охове дзяржавы. Лік арыштаваных за апошні час перавісіў 100 чалавек.

Пад знакам выкрываньня здрадніцтва рэфармістаў.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЛЕВАГА КРЫЛА АНГЕЛЬСКАГА РАБОЧАГА РУХУ.

ЛЁНДАН, 24-9. Заўчора і сёньня ў Лёндане з вялікім посьпехам прайшла канфэрэнцыя левага крыла ангельскага рабочага руху, якая ўхваліла шэраг рэзалюцый.

Разолюцыя па пытаньні аб замежнай палітыцы рабочае партыі, ўхваленая адназгодна, пратэстуе проці падтрыманьня Лігі Нацый, патрабуе адмовы ад мэтадаў імпэрыялістычнае дыпляматыі, якія вядуць да вайны, патрабуе адначас поўнай дыпляматычнай і гандлёвыя адносіны з СССР і падтрымаць савецкія праэкты разброеньня. Далей рэзалюцыя патрабуе вываду ангельскага войска з Эгіпту, Кітаю, Індыі і інш.

Канфэрэнцыя ўхваліла тэкст дэкларацыі аб выбарчай палітыцы левага крыла. У гэтай дэкларацыі зазначаецца, што выбарчая плятформа рабочае партыі далкам разьлічана па падтрыманьне капіталістычнае палітыкі. Левае крыло будзе поўнасьцю падтрымліваць парляманцкія кандыдатуры камуністычнае партыі.

Стакгольм—цэнтр антысавецкага фронту.

БЭРЛІН, 24-9. Наконт падарожжа прэзыдэнта Эстоніі і прэзыдэнта Фінляндыі ў Стакгольм і візыты латвійскіх вайсковых суднаў у Швэдыю, стакгольмскі карэспандэнт газэты „Таг" заяўляе, што цэнтр цяжару антысавецкага фронту пачынае перамяшчацца з Варшавы ў Стакгольм і што гэта павінна дапамагчы ўцягнуць у антысавецкі блёк апошняе зьвяно—Літву. «Тады,—піша далей карэспандэнт,—мэта Англіі будзе дасягнута. Абрысы гэтага блёку вызначаюцца ўсё выразьней».

Бягучы момант і нашая прэса.

Даклад т. Молатава на ўсесаюзнай нарадзе рэдактароў.

Нядаўнія гаспадарчыя цяжкасьці ўжо ў большасьці зьнішчаны. Шырокія масы працоўных дружна ідуць партыі на падмогу.

Аднак, поруч з ростам элемэнтаў сацыялістычнага будаўніцтва, у нас яшчэ застаюцца самыя агідныя перажыткі дарэвалюцыйнага панска-буржуазнага ладу. Практычнае разгортваньне ЛЁЗУНГУ САМАКРЫТЫКІ нам зараз АСАБЛІВА ПАТРЭБНА, каб з усёю сілаю, ПРЫ АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ МАС, ЗЬНІЗУ ўдарыць па гэтых перажытках цяжкога мінулага.

ЗАДАЧА ПРЭСЫ—стаць сапраўдным камуністычным выхаваўцай партыйных рабочых і сялянскіх кадраў, рашуча змагаючыся з усякімі праявамі апартунізму.

Значэньне друку сёньня.

Гэтая нарада—кажа тав. Молатаў—вельмі насьпешная справа. Друк і, перш на перш, нашыя газэты занялі выдатнае месца ва ўсёй працы партыі, ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. У сучасны пэрыяд значэньне друку і, у першую чаргу, нашых газэт асабліва ўзрастае ў зьвязку з тым, што партыя высунула такія лёзунгі, як лёзунг культурнае рэвалюцыі і лёзунг самакрытыкі.

Зразумела, самакрытыка не павінна быць выключнаю прыналежнасьцю друку. Лёзунг самакрытыкі ў сучасных умовах павінен прасякнуць праз усю працу кожнага камуніста, кожнага сьвядомага пралетарыя, у якой арганізацыі ён ні працаваў-бы. Трэба толькі на нарадзе рэдактароў газэт сумленна прызнаць, што і ў адносінах да самага друку гэты лёзунг таксама мае зараз вельмі актуальнае значэньне.

Аднэю з асноўных умоў для шырокага практычнага разгортваньня лёзунгу самакрытыкі зьяўляецца той факт, што палітыка партыі сустракае дружную падтрымку самых шырокіх мас рабочае клясы, а таксама шырокіх гушчаў ня толькі батрацтва і беднаты, але і серадняцкае масы вёскі.

Станоўчы гаспадарчы пералом.

Абвастрэньне гаспадарчых перашкод у першай палове сёлетняга году набыло вялікае значэньне для ўсяго гаспадарчага жыцьця. Гэтыя перашкоды хацелі выкарыстаць і нашыя клясавыя ворагі, буржуазныя элемэнты ў горадзе і на вёсцы (кулакі). Аднак, галоўныя даныя гэтага гаспадарчага году і намечаныя пакуль-што яшчэ з большага пэрспэктывы новага гаспадарчага году даюць падставу думаць, што і ў новым гаспадарчым годзе мы зробім буйныя крокі ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Адзначаючы рост нашага бюджэту для новага гаспадарчага году (прыблізна на 15-20 проц.) і асабліва ўзмацненьне ў будучым годзе тэмпу разгортваньня цяжкае прамысловасьці, тав. Молатаў пераходзіць да асьвятленьня пабудовы сельскае гаспадаркі. Адзначаючы, што ўвогуле сёлета ўраджай ня меншы за леташні, тав. Молатаў кажа: такім парадкам мы маем чацьверты ўраджайны год засаб, гэтага нельга ня прызнаць вельмі спрыяючаю ўмоваю для далейшага гаспадарчага жыцьця. Шырокімі мерапрыёмствамі ў справе насеннае дапамогі (блізка 40 міліёнаў пудоў насеннае пазыкі выдана дзяржаваю бядняцка-серадняцкім гушчам вёскі, чаго ніколі ня было ў мінулыя гады) савецкая ўлада яскрава падкрэсьліла перад шырокімі масамі вёскі сваю глыбокую ўважлівасьць да патрэб сялянства.

Гэтыя захады ня могуць ня мець і вялізнага палітычнага значэньня на вёсцы.

Новая хлебазагатоўчая кампанія спазьнілася на шмат якіх прычынах (пагібель значнае часткі засеваў на поўдні, халоднае лета ў цэнтральнай паласе і г. д.). Аднак, ход хлебазагатоўчае кампаніі сьведчыць аб посьпеху ле разьвіцьця. Тэмп росту хлебазагатовак зараз не адстае ад мінулых гадоў. Больш таго, апошняя пяцідзёўка, за 16-20 верасьня, паказала ня толькі значны рост проці папярэдніх пяцідзёвак, але і сваёю лічбаю (больш 18 міліёнаў пудоў) перавышае любую пяцідзёўку ў верасьні мінулага году (найбольшая пяцідзёўка летась у верасьні дала 17,2 міліёнаў пудоў) і наогул любую пяцідзёўку верасьня мінулых гадоў.

Абвастрэньне гаспадарчых перашкод мы пачынаем зжываць. Гэта ня значыць, што сярод нас уже няма камуністаў, якія і да гэтага часу ня хочуць прыкмячаць, што ў адносінах хлебазагатовак здарыўся выразны пералом, які мы і павінны зараз замацаваць усімі сіламі для посьпеху правядзеньня ўсяе хлебазагатоўчай кампаніі. Хныканьню наконт цяжкасьцяў, якія сустракаюцца на шляху пяўхільнага росту сіл сацыялістычнае рэвалюцыі, партыя ў адназгодных пастановах апошняга пленуму ЦК проціставіла практычныя захады барацьбы за перамогу гэтых цяжкасьцяў. Нашым абавязкам зьяўляецца—націснуць на ўсе рычагі, каб замацаваць намечаны пералом у хлебазагатоўках, і ва ўсёй гаспадарчай працы — забясьпечыць далейшыя яшчэ больш буйныя посьпехі.

Удар па антысавецкіх сілах заграніцаю.

За межамі СССР, як відаць, памалу таксама пачынаюць разумець беспадстаўнасьць і нясумленнасьць інфармацыі аб бязвыхадным становішчы і перашкодах у Савецкім Саюзе, хоць да самых апошніх дзён гэтай недабракласнай інфармацыяй была перапоўнена імпэрыялістычная і ў тым ліку сацыял-дэмакратычная прэса. Шмат адзнак такога абвастрэньня, якое адбываецца, аднак, наперакор росту шаленства імпэрыялістычных ворагаў СССР, заўважан наяўна. Перарваныя Нямеччынаю гандлёвыя перамовы аднаўляюцца па ініцыятыве нямецкага ўраду. Распачаты ўжо націск некаторых чужаземных банкаў у галіне крэдыту пакуль што, нібыта, спыніўся. Надыходзяць весткі аб спробах пашырыць гандаль з СССР з боку чужаземных капіталістычных колаў, у тым ліку, такіх дзяржаў, якія ня маюць нармальных зносін з СССР. Заразумела мы нікольні не гарантаваны ад таго, што заўтра-пазаўтра пануючыя капіталістычныя групы тае ці іншае загніўшае на корані імпэрыялістычнае дзяржавы не паспрабуюць ізноў і ізноў схапіцца за зброю адкрытае ці напалову адкрытае эканамічнае блёкады проці СССР. І ўсё-ж такі той факт, што ў нас ужо настаў некаторы пералом у гаспадарчых абставінах пасьля часовага абвастрэньня ў першай палове году, ужо адбіваецца некаторым чынамі на адносінах капіталістычных дзяржаў да СССР. Тым мацней належыць нам націснуць на ўсе рычагі ўздыму нашае гаспадаркі.

З самакрытыкаю на перажыткі старога.

Мы жывём ва ўмовах пераходнага пэрыяду. Поруч з нарастаючымі элемэнтамі сацыялістычнага будаўніцва, навокал нас яшчэ застаюцца самыя агідныя перажыткі дарэвалюцыйнага абшарніцка-буржуазнага ладу. Практычнае разгортваньне лёзунгу самакрытыкі нам зараз асабліва патрэбна, каб з усёю сілаю, пры самым актыўным удзеле мас, зьнізу выцяць па гэтых перажытках дарэвалюцыйнага мінулага, якое гэтак выразна выяўляецца ў наліччы шматлікіх бюракратычных элемэнтаў у працы нашых органаў. Самакрытыка дапаможа прыбраць з-пад ног сацыялізму шмат якія цьвілыя элемэнты мяшчанска-буржуазна-прыгоньніцкага мінулага нашага краю.

Паказваючы на прыкладах рост перад нашымі вачыма сапраўды сацыялістычных элемэнтаў у нашым краі, тав. Молатаў зазначае, што адначасна на кожным кроку мы натыкаемся на калючы дрот перагародак (рэштаў) прыгону і фэадалізму ў вёсцы, глыбокіх бюракратычных балячак у апараце і г. д., якія сацыялізм павінен нясупынна скідаць са шляху свайго пераможнага разьвіцьця.

Найбольшыя цяжкасьці ў справе сацыялістычнага будаўніцтва былі і застануцца на вёсцы. Між тым, кажа т. Молатаў, трэба проста сказаць, што неабходная дапамога пралетарскага гораду серадняцка-бядняцкай вёсцы ўсё яшчэ малая. А гэтая дапамога вёсцы зьяўляецца галоўным элемэнтам пралетарскага кіраўніцтва сялянскімі масамі. Калі ў гарадох мы і зараз яшчэ сустракаемся з такімі фактамі, як бюракратычны зажым мас і выпадкі загніваньня ў кіруючых органах, як гэта выкрылася ў Смаленску (з фабрыкаю «Катушка» і інш.), дык у вёсцы нячуваныя злачынствы ў працы розных органаў і злоўжываньні,—асабліва ў адносінах да вясковае беднаты,—усё яшчэ сустракаюцца вельмі часта. У нас досыць і занадта досыць законаў савецкае ўлады, якія так добра адказваюць на затрабаваньні серадняцка-бядняцкіх мас вёскі, а на справе нашыя органы ў вёсцы вельмі часта ня могуць забясьпечыць самае звычайнае рэвалюцыйнае законнасьці ў інтарэсах гэтых мас.

Факт, якому цяжка паверыць.

Мне давядзецца падаць з галіны беззаконства і цэмры вясковага жыцьця такі факт, у які, здавалася-б, цяжка нават паверыць. Але факт, пра які я скажу далей, зараз ужо падрабязна высьветлены ў адной мясцовай і адной цэнтральнай газэце. Справа ідзе аб тым, як у канцы чэрвеня ў 3-х вёсках Воцкае аўтаномнае вобласьці было высечана 300 сялянвацякоў (рух у залі). Недалёка ад гораду Іжэўску знаходзяцца 3 вёскі:: Людарвай (за 9 вёрст ад абласнога цэнтру), Людзі і Юскі. Вось як «Ижевская Правда» (ад 11-га ліпеня) асьвятляе выпадак «поркі» сялян у вёсцы Людарвай: «Раніцою а 4-й гадзіне секлі ля школы, затым перайшлі да пажарнага дэпо. Большасьць падыходзіла в пакорлівасьцю, моўчкі падстаўляючы сьпіну. Секлі важка. Адзін чалавек, бацьку якога расстралялі белыя, тры дні ляжаў у пасьцелі пасьля «поркі». Жанчына ламантавала на ўсю вёску—секлі хлапчукоў 14-15 гадоў, амаль што дзяцей. Хто ня быў на сходзе—выклікалі, каб высечы. Потым схаміналіся, рашылі скласьці пратакол; хто не падыходзіў падпісаць—прыходзілі да яго ў хату, у хаце не лупцавалі, вялі ў пажарную. Некаторыя абараняліся,—хто сякераю, хто стрэльбаю...»

У чым-жа справа, якія прычыны гэтага факту—Людарвайскае справы? Прычэпкаю да сьцебаніны, як тлумачыць шмат хто ў самой вёсцы, было тое, што частка сялян не паправіла сваіх загародак, з-за чаго жывёла трапляла на чужое поле (галасы: хто сек?) Як усё гэта адбывалася—далей убачыце. Секлі, як выявілася, самі-ж сяляне. Людарвайскіх сялян пачала сячы з'арганізаваная група людзінскіх сялян. Нездарма перад сьцебанінаю некаторыя заможныя сяляне наладжвалі сваю нараду ў лесе. Секлі чарэмхавымі дубцамі, якія былі прыпасаны загадзя. Высеклі шмат і такіх сялян, загародкі якіх былі ў поўнай спраўнасьці. Больш за ўсё злосьць спагналі на бядняцкім целе, у значнай частцы і на серадняках. Скаргаў кулакоў наконт гэтага пешта ня чуваць.

Кулацкае засільле яшчэ не пераможана

Якая-ж сапраўды прычына гэтага нячуванага зьдзеку над сялянамі-беднякамі і сераднякамі 3-х Воцкіх вёсак? Зразумела, прычына ня ў плоце. Прычыны трэба шукаць у клясавай сутнасьці гэтага факту.

Вяцкі вабласны камітэт праз спэцыяльную камісію абсьледаваў становішча на месцы. Супрацоўнікі газэты «Ижевской Правды» і маскоўскае «Бедноты» таксама там пабывалі. Газэтамі і кіраўнічымі органамі Вяцкае вобласьці даецца ў агульным аднолькавая ацэнка сапраўдных прычын гэтага факту зьдзекаў над сялянамі. Больш падрабязна апісан гэты факт у адносінах вёскі Людарвай, у якой 193 двары і каля 1.000 жыхароў, і з якое было вылупцавана да 150 сялян. У гэтай вёсцы, асабліва за апошнія гады, абвастрылася пытаньне аб зямлякарыстаньні. Але і не магло быць інакш, калі ўзяць пад увагу наступнае паведамленьне «Ижевской Правды» аб вёсцы Людарвай: «Перадзелу зямлі ўжо ня было 46 гадоў. Зямля разьмеркавана водлуг ліку рэвіскіх душ. Апрача гэтага заможная частка мае ўтоеную зямлю, як казаў адзін, дзедаўскую, пакінутую па тэстамэнту. На ўсе нясьмелыя просьбы аб перадзеле забясьпечаная частка вёскі пагражала рознымі мерамі, аж да таго, што вось «мы заб'ём цябе». Беднота выказвала некаторую актыўнасьць у камітэце ўзаемадапамогі. Ёй быў моцны ня столькі матар'яльна, колькі даваў магчымасьць легальна зьбірацца. На агульным сходзе, пад кіраўніцтвам заможных, камітэт узаемадапамогі быў скасаваны, і нават старшыню і сэкратара камітэту выгналі са сходу. Хлебазагатоўкі асабліва абурылі верхавіну вёскі».

Як відаць з матар'ялаў, надрукаваных у газэтах, пачынаючы з 1924 г. сяляне-беднякі пачалі настойна ставіць пытаньне аб перадзеле і аб вылучэньні для іх зямлі пад высялковае таварыства. Але ў працягу некалькіх гадоў іх старэннасьць ня мела посьпеху, а ў савецкіх канцэлярыях (у зямельных управах і інш.) нават два разы прападаў статут новага таварыства. У гэтым годзе за справу арганізацыі таварыства ўзяўся дэмабілізаваны чырвонаармеец-культурнік, серадняк Калінін. Як відаць, гэта—адзін з тых перадавых маладых сялян, якія ў нас прайшлі вядомую грамадзкую школу і здольны, абапіраючыся на беднату, узрошчваць храсткі новае савецкае вёскі. Мясцовае кулацтва зразумела, што трэба ўжываць нейкія выключныя меры, каб абараніцца ад гэтых пачынаючых актыўна дзейнічаць беднякоў і сераднякоў. З гэтаю мэтаю, нібы, для абароны інтарэсаў больш дбайных гаспадароў, кулакі і заможныя сяляне пастанавілі так пакараць і так запалохаць беднату, а заодно ўжо і сераднякоў, каб яны адмовіліся патрабаваць вылучэньня зямлі для бядняцкага таварыства і ад іншых сваіх надзей на новае жыцьцё ва ўмовах савецкага ладу. Шмат цікавых падрабязнасьцяў кулацкага засільля ў гэтых вёсках падае „Ижевская Правда" 1 „Беднота". Тут і выразна несправядлівае абкладаньне сельска-гаспадарчым падаткам беднаты з палёгкамі для заможных сялян, тут і засільле кулакоў у органах мясцовае каапэрацыі і ў саветах, дзе, не зважаючы на большасьць абраных у гэтыя органы беднякоў, фактычна кіравала ўсімі справамі заможна-кулацкая група. Тут і роспуск сялянскага камітэту пад нажымам кулакоў.

Камуністы не заўсёды ў курсе спраў.

Вы запытаеце, ці былі ў волясьці камуністы. Камісія абласнога камітэту ў сваім дакладзе паведамляе, што ў валасной партыйнай арганізацыі ёсьць 23 члены і 13 кандыдатаў. Як відаць, ёсьць і камсамольская арганізацыя. Але аб зьбіваньні сялян Людарвая валасному к-ту нават ня было вядома да прыезду камісіі абласнога камітэту. Вось як, з дазволу сказаць, «працуюць» некаторыя нашыя вясковыя арганізацыі. Няма чаго і казаць аб тым, што сельсаветы і валасныя камітэты ня толькі не перашкодзілі агіднаму зьбіваньню сялян у ранейшай Нор'інскай волясьці, якая цяпер называецца—не жартуйце—савецкай волясьцю, у якую ўваходзяць вёска Людарвай. Мясцовыя валасныя кіраўнікі і пасьля гэтага факту пінкім чынам не хацелі зразумець, чаму факт збойства сялян выклікае такую ўвагу ў друку і вышэйшых органах савецкае ўлады.

Вось якія факты, як яшчэ бачыце, магчымы на 11-м годзе савецкае ўлады. Паданы мною факт, зразумела, узяляе сабою выключнае зьявішча. Але адна магчымасьць такіх фактаў гаворыць аб тым, як шмат яшчэ застаецца на вёсцы рэштаў ранейшага панаваньня земскіх начальнікаў і іім. буржуазна-абшарніцкіх прыслугачоў. Асноўны вывад з пададзенага факту зразумелы. Больш увагі таму, што робіцца ў глыбіні вёскі. Больш увагі і больш сапраўднае савецкае працы ў гушчы сялянскіх мас. Людарвайская справа і шмат якія яшчэ факты бялячак і агідпасьцяў у вясковым жыцьці даволі падкрэсьліваюць своячасьць усебакова разгортваньня лёзунгу самакрытыкі на практыцы.

Само сабой зразумела, што практычнае разгортваньне лёзунгу самакрытыкі ва ўмовах вёскі патрабуе вялікае ўвагі і сапраўднага палепшаньня партыйнага кіраўніцтва ў гэтых адносінах.

Рушыць нізы на палепшаньне апарату.

Аднак, і пяпер факты навакол таго, што здарылася ў Людарваі, Людзьі і Юскі, нельга лічыць даволі асьветленымі. Ва ўсякім разе, ніяк нельга лічыць, што мы зрабілі ўсё, што выплывае з Людарвайскае справы. Да гэтага часу ніводная газэта не паведаміла, што-ж у выніку зроблена ў Людарваі, Людзьі і Юскі для каранное зьмены становішча на месцы. Як рэагуе цапер беднота і ўся бядняцка-серадняцкая маса, і ці адхілена ад упліву на мясцовыя органы кулацкая верхавіна? Аб усім гэтым яшчэ нічога ня чуваць. Варта сказаць і аб тым, што акрамя «Бедноты» ніводная цэнтральная газэта да гэтае пары не адгукнулася на Людарвайскую справу. Між тым, патрэбна, каб каранное палепшаньне ў працы мясцовых органаў—саветаў, каапэратываў і г. д., а разам з тым і партыйных арганізацый—было цяпер сапраўды забясьпечана і пры тым абавязкова пад пільным кантролем і пры належнай дапамозе з боку кіраўнічых органаў.

Людарвайская справа яшчэ раз паказвае, што барацьбу за палепшаньне нашага дзяржаўнага апарату нельга весьці толькі зьверху. Яна таксама

(*Працяг дакладу на 2-й стар.*)

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Дашынскі перабег да пілсудчыкаў.

ВАРШАВА, 26-9. Друк на спынае абмяркоўваць кампанію старшыні сойму пэпэсаўца Дашынскага, каб сяласьні сталую большасьць у сойме. Апошнія выступленьні Дашынскага сьведчаць, што ён канчаткова далучыўся да лягеру пілсудчыкаў і праводзіць іх палітыку. Адна з газэт паведамляе, што выключнае імкненьне Дашынскага сказьні ўрадавую большасьць у сойме зьяўляецца вынікам інтэрнэ Дашынскага з Бартэлем. Дашынскаму было сказана, што, калі ў сойме ня будзе большасьці для правядзеньня ўсіх мер, якія ўрад лічыць важнымі дык сойм будзе разагнаны.

Арышты камуністаў у Латвіі.

„Газэта Варш." (№ 283) паведамляе, што ў сувязі з надыходзячымі выбарамі ў сойм палітычная паліцыя амаль штодня арыштоўвае камуністаў. Гэтымі днямі арыштаваны 3 камуністы ў Вальмары, пры гэтым яны забарыкадаваліся ў памяшканьні. Паліцыя высадзіла дзьверы і, пасьля доўгай барацьбы, арыштавала іх. З Дзвінска, Рэжыцы і іншых гарадоў прыходзяць весткі, што камуністы вызваляюць на будынках і тэлеграфных дратах чырвоныя сьцягі з надпісамі: „Няхай жыве Савецкая Латвія".

Цікавы выпадак з граматыкай Б. Тарашкевіча.

Б. Тарашкевіч, які сядзіць цяпер па справе „Грамады" ў астрозе, прагледзеў нядаўна сваю бел. граматыку і дапоўніў яе, згодна апошніх вымаганьняў школы, пасьля чаго выслаў яе па адрасу кнігарні „Выдавецкага т-ва ў Вільні". Аднак, замест кнігарні, граматыка папала ў „пракурорскую ўправу". І загадчыку выдавецтва і жонцы Тарашкевіча граматыку выдаць адмовіліся і сказалі, што калі граматыка будзе выслана на імя жонкі Тарашкевіча, дык тады яна будзе выдана. Так умеюць жартаваць паны польскія пракуроры.

13 жніўня г. г. граматыцы Тарашкевіча споўнілася 10 год.

Сход Т-ва Беларускай школы.

«Дачасная Паўнамоцная Камісія», якая заняла сабою зачыненае 28 жніўня г. г. „Т-ва Беларускай школы" зьвярнулася да ўсіх акруговых управаў, гуртком і сяброў з паведамленьнем аб тым, што агульны сход «Таварыства» склікаецца на дзень 21 кастрычніка г. г.

Тэатр для беларусаў у Горадні.

У Горадні існуе беларуская культурна-асьветная арганізацыя—«Т-ва бел. школы». Ад яе імя бел. радны Кулакоўскі ўнёс у Гарадзенскі магістрат прапазіцыю аб прадастаўленьні беларусам і рабочым прафсаюзам 12 вечароў у год у гарадзкім тэатры для пастаноўкі спэктакляў.

„Хвароба" сярод ППС.

23 верасьня г. г. пэпэсавец і пасол сойму Явароўскі прачытаў у Варшаве рэфэрат на тэму «Хваробы легальнага рабочага руху». Рэфэрэнт парушыў справу сучасных разыходзін сярод ППС, пры гэтым сьцьвердзіў, што ён „ня можа выказаць усяго на публічным рэфэрацэ, таму што гэтую справу належыць абгаварыць у партыйных арганізацыях, і што варшаўскай арганізацыі абвешчана барацьба, барацьба гэтая будзе падмята і павінна быць выіграна".

Далей п. Явароўскі падкрэсьліў заслугі Пілсудзкага і В. Канарковіча для рабочага руху.

Канфіскацыя.

№ 7 «Рэха Працы» паведамляе, што № 6 гэтай газэты быў канфіскаваны за артыкул: «Скандал падчас карапацыі абраза ў Сыборы» і заметкі: «Забойца—апраўданы», «Лёс работніка» і «Арыштаваньне б. вучня белар. гімназіі».

6-ы і 7-ы нумары „Сахі".

Выйшла ў Вільні з друку 6-7 кніжка сельска-гаспадарчага месячніка „Сяха". Зьмест: 1) аб камасацыі, 2) вашуем глебу, 3) змаганьне з сарнякамі, 4) пажаданьне корму ў гаспадарцы праз сілосаваньне, 5) кармавыя сурагаты, 6) колькі можна атрымаць малака ад сялянскае кароны, 7) гадоўля ліна і гарасу ў стаўках і г. д.

Умястоўскі заводзіць панчыну.

«Рэха Працы» (№ 7) паведамляе, што рэдактар выдавец «Беларускага Дня» п. Умястоўскі яшчэ ў ліпені г. г. звольніў з пасады карэктара М. Косьцевіча, а той скіраваў справу да Інспэктара Працы, дамагаючыся трохмесячнага адшкадаваньня. Цяпер п. Умястоўскі набраў ад сваіх

ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ т. МОЛАТАВА.

паказвае, што ўцягненьне мас у справу барацьбы з гэтымі недахопамі да гэтае пары ідзе слаба. Між тым, гэтая барацьба павінна весьціся, калі можна так сказаць, **ня толькі зьверху, але і зьнізу.** Галоўны сэнс лёзунгу самакрытыкі ў тым, каб **уцягнуць масы ў барацьбу з недахопамі нашых органаў і асабліва ўзмацніць гэтую барацьбу зьнізу.**

Пры гэтым боязь распачынаць самакрытыку зьнізу, боязь перад тым, што радавы рабочы ці бядняк на вёсцы «крытыкне» вельмі моцна, ці вельмі груба, ёсьць толькі адна з горшых разнабачнасьцяў бюракратычнага падыходу да мас. З гэтаю бюракратычнаю боязьзю ў нашым апараце мы павінны весьці сыстэматычную і бязьлітасную барацьбу.

Ці не выяўляецца часам у нас бюракратычны наскок і на адносіны некаторых органаў да рабселькораўскага руху? Увага да гэтае справы за апошні час вельмі значна паслабілася. Трэба спадзявацца, што склікаемы «Правдой» зьезд рабселькораў значна ўзьніме гэтую справу.

Разгортваньне самакрытыкі азначае ня толькі ўцягваньне мас у працу ўсіх пралетарскіх арганізацый, але і **перавыхаваньне мас на падставе іх удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.** Задачай сацыялізму зьяўляецца ня толькі перабудова дробнае гаспадаркі, але і перавыхаваньне саміх працоўных мас і перш усяго сацыялістычнае выхаваньне авангарду працоўных—рабочае клясы. **З гэтага зразумела, якое глыбокае палітычнае значэньне мае лёзунг самакрытыкі.**

Друк мусіць быць на аванпостах самакрытыкі.

Сярод прысутных тут таварышоў, мабыць, ня мала знойдзецца такіх, якія пры дакладах аб самакрытыцы часта спамінаюць аб цяжкасьцях, якія сустракае практычнае разьвіцьцё гэтага лёзунгу. Бясспрэчна, гэтых цяжкасьцяў шмат. Часамі нават партыйныя арганізацыі, замест неабходнага падтрыманьня органаў друку ў гэтай справе, слаба змагаюцца в бюракратычнымі адносінамі да самакрытыкі. Працаўніком друку, перш усяго рэдактарам мясцовых газэт, павінна быць вядома шмат гэткіх фактаў.

Нездарма-ж **наш друк і, перш усяго, лепшыя з нашых газэт сапраўды стаяць на аванпостах самакрытыкі.** Газэты, сапраўды зьвязаныя з рабочымі і сялянскімі масамі, атрымліваюць зараз вялікі матар'ял ад радавых рабочых і сялян з крытыкаю недахопаў працы савестаў, каапэратываў, прафсаюзаў, гаспадарчых органаў і саміх партыйных арганізацый. Усё часьцей гэты матар'ял зьмашчаецца ў нашых газэтах. Бяз шырокага скарыстаньня яго ў друку немагчыма разгарнуць самакрытыку на практыцы. Лепшыя працаўнікі газэт, якія ідуць зараз у авангардзе самакрытыкі, павінны і ў далейшым цьвёрда, пасьлядоўна, парэвалюцыйнаму, пакамуністычнаму трымацца гэтага. Трэба зьнішчыць гэткія факты, калі «лісткі РСІ» уяўляюць сабой нейкую нібы чужародную частку газэты. **Трэба дамагчыся таго, каб газэты пад кіраўніцтвам партыі яшчэ мацней абстрэльвалі недахопы, яшчэ мацней білі па балячках бюракратызму.** Там, дзе ў гэтым будзе асабліва неабходнасьць, дапамогуць мясцовым газэтам і вышэйшыя партыйныя органы. Але трэба, каб і кіруючыя працаўнікі газэт заўсёды памяталі, што яны выконваюць толькі частку тае працы, якая ў нас ажыцьцяўляецца над кіраўніцтвам партыйных арганізацый, над кіраўніцтвам партыі.

Як вядома, за апошнія 4 гады **тыраж** газэт павялічыўся ў два разы. **І ўсё-ж такі нашыя газэты не дахо**дзяць яшчэ да міліёнаў і міліёнаў працоўных. Таму нельга ня прызнаць, **што зусім насьпела стварэньне магчыма больш папулярнае газэты, напрыклад. «Рабочей Копейки», таксама** неабходна дамагчыся большае даступнасьці «Крестьянской Газеты» для найбольш адсталых гушчаў вёскі.

Выключна цяжкая роля друку ў справе гаспадарчага будаўніцтва добра вядома. У гэтай галіне ў нас да апошняга часу нездавальняюча былі абслужаны патрэбы сельскае гаспадаркі. Таму **ЦК прызнаў неабходным выдаваць новую вялікую сельска-гаспадарчую газэту.** У ёй павінны ўзяць самы актыўны ўдзел цэнтральныя і асабліва мясцовыя працаўнікі зямельных органаў і працаўнікі ўсіх галін каапэрацыі, зьвязанае з вёскаю.

Заганы самога друку.

І яшчэ вярнуся да самакрытыкі ў адносінах да самога друку. Чамусьці ня чуваць у нас аб такіх выпадках, калі-б кіраўнічыя цэнтральныя органы друку крытыкавалі іншыя кіраўнічыя цэнтральныя органы, і амаль адсутнічае крытыка органаў мясцовага друку. Між тым, пры нанапольным становішчы камуністычнага друку адсутнасьць самакрытыкі ў гэтай галіне вельмі шкодна. Добра было-б па гэтай лініі зрабіць некалькі крокаў ня толькі ў цэнтры, але і ў абласьцёх.

Трэба, нарэшце, закрануць і пытаньне аб пастаноўцы нашае інфармацыі. У зьвязку з гэтым і, галоўным чынам, у зьвязку з інфармацыяй па пытаньнях міжнароднага становішча, мне прыдзецца закрануць і такую надважную ўстанову, як ТАСС (галасы з месц: просім). У гэтай галіне насьпела неабходнасьць значных палепшаньняў. У нашай замежнай інфармацыі мы маем іншы раз самыя «цікавыя» падрабязнасьці. Напрыклад, паведамлялася аб тым, якою асадкаю і з якога каламара і якія ўласна дыплёматычныя Іваны Іванавічы і Паўлы Паўлавічы падпісвалі „вядомы" (як відаць сваёю фальшу) пакт імпэрыяліста Келёга. Ясна, што гэтыя глупствы ні рабочым, ні сялянам непатрэбны. Шмат глупстваў паведамляецца і аб падзеях і жыцьці таго ці іншага генэрала Чжана ў Кітаі. Вельмі шмат увагі і да недарэчнае балбатні розных сацыял-прахвостваў, накшталт Поля Бонкура ў Лізе Нацый. Аб гэтых рэчах належала-б паведамляць куды карацей. Мы павінны сачыць за кожным колькі-небудзь значным паваротам новае падзеі ў лягеры буржуазных і, спэцыяльна, сацыял-імпэрыялістычных колаў. І побач з гэтым—**гэта галоўнае**—вельмі нездавальняючая ўвага да асноўных пытаньняў эканамічнага і сацыяльнага разьвіцьця заграніцаю і зусім мала ўвагі да пытаньняў сапраўднага становішча працоўных мас у буржуазных краёх.

Задачы друку вызначаюцца ня толькі ўнутранымі, але і міжнароднымі абставінамі.

Задачы друку ў змаганьні з праявамі апартунізму.

У зьвязку з гэтым, нельга не зазначыць на пастановы 6-га кангрэсу Камінтэрну, які даў з вялікаю паўнатою аналіз сучаснага міжнароднага разьвіцьця. 6 кангрэс ухваліў праграму Камінтэрну. Праграма паставіла перад міжнародным пралетарыятам задачу барацьбы за сусьветную пралетарскую дыктатуру ва ўвесь рост. Значнейшым, пасьля праграмы, дакумэнтам кангрэсу зьяўляецца асноўная палітычная рэзалюцыя. У ёй 6-ты кангрэс асабліва падкрэсьліў неабходнасьць узмацніць барацьбу ўнутры кампартый проці правых ухілаў і проці прымірэнчых адносін да гэтых ухілаў. Гэтая дырэктыва ў рэзалюцыі кангрэсу асабліва разьвіта ў адносінах асобных замежных кампартый.

Нашая партыя працуе ў асаблівых умовах, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту. У нас няма нават колькінебудзь значных рэштак сацыял-дэмакратыі. З другога боку, у краі з пераважаючым дробна-буржуазным жыхарствам ня можа ня быць шматлікіх шляхоў для дробна-буржуазных уплываў на асобныя прасойкі ў партыі. Усім памятна тая барацьба, якую партыя праводзіла проці аднае з разнабачнасьцяў дробна-буржуазнае ідэалёгіі, — трацкізму. **Новыя спробы ажыўленьня трацкісцкіх элемэнтаў патрабуюць узмоцніць паслабнуўшую ў апошні час увагу да барацьбы з імі.** Пасьля ганебнага краху нішто ўжо ня можа апраўдаць яких-небудзь надзей на ўзмацненьне ўплыву трацкізму ў нашай партыі, але ідэйна-палітычная праца ў гэтых адносінах павінна зараз узмацніцца, нездарма трацкісцкія элементы спрабуюць карыстацца зараз такімі «сродкамі», як самыя дурныя плёткі і паклёпы на партыю, а таксама брахня пакont хваробы «лідэра». Да такіх трацкісцкіх сродкаў адносіцца распаўсюджаньне плётак аб «правым» і «цэнтрысцкім» крыле ў Цэнтральным Камітэце партыі. Аднадушныя пастановы партыі зьяўляюцца належным адказам на гэтыя плёткі і паклёпы. Аднак, трацкізм, які скінуў з сябе вопратку „лявізны" і абярнуўся ў досыць адкрытаменшавіцкую плынь, зьяўляецца толькі аднэю з разнабачнасьцяў апартунізму ў нашых умовах.

Барацьба на два фронты.

Нельга ня лічыцца з тым, што ў нас ёсьць і іншыя разнабачнасьці апартуністычных настрояў. Ліпнёўскі пленум ЦК ізноў зазначыў на **неабходнасьць барацьбы на два фронты:** як проці тых элемэнтаў, „якія імкнуцца надаць надзвычайным і часовым захадам характар пастаяннага прымусовага курсу і тым самым паставіць пад пагрозу справу саюзу рабочых і асноўных мас сялянства" так і проці тых элемэнтаў, „якія зьяўляюцца адбіткам буржуазных тэндэнцый у нашым краі і спрабуюць абыйсьці пастановы XV зьезду „разгортваць далейшы наступ на кулацтва". **Проці такіх ухілаў ад партыйнае лініі мы і зараз павінны сыстэматычна змагацца.** Пры гэтым трэба памятаць наступнае. Калі ў нашых радох, бясспрэчна, нельга дапушчаць такога становішча, „калі самастойная думка і кожная крытычная заўвага загадзя адкідаюцца, як „ухіл", „буазцёрства" і г. д.—як гэта зазначана ў ліпнёўскім звароце ЦК—дык з другога боку, **розным спробам абароны антыленінскіх «тэорый» аб цярпімасьці да груповак і ўхілаў ад генэральнага бальшавіцкага напрамку партыя ніколі ня дасьць месца ў сваіх радох.** Пасьля разгрому трацкізму пры ўсёй неабходнасьці далейшае барацьбы проці новых спроб яго ажыўленьня, перад партыяй пастаўлена задача ўзмацненьня барацьбы проці другіх і, перш-на-перш, проці адкрытых і напалову адкрытых апартуністычных ваганьняў. Гэта цалкам выплывае і з пастаноў 6-га кангрэсу аб узмацненьні барацьбы **іменна проці правых ухілаў.**

Быць на варце бальшавіцкага выхаваньня мас.

У партыі ёсьць моцная база для працы ва ўмовах бягучага моманту. Гэтая **база—пастановы XV зьезду і далейшыя пастановы кіруючых органаў партыі.** На падставе гэтых пастаноў, даючы адпор розным ваганьням і розным ухілам у той ці іншы бок, **партыя цьвёрда, бяз нервовасьці праводзіць сваю працу.** На падставе пастаноў партыі і дырэктыў 6-га кангрэсу **аб узмацненьні барацьбы проці апартуністычных уплываў,** партыя ўзмацняе свае рады і яшчэ мацней згуртоўвае масы пад сваім кіраўніцтвам.

Ва ўсім гэтым друк і, між іншым, газэты выконваюць вялічэзную ролю. Калі роля друку вялічэзная ў справе практычнага будаўніцтва сацыялізму, **дык у яшчэ большай меры мае значнасьць роля друку ў справе сапраўды бальшавіцкага ідэёвага выхаваньня камуністычных кадраў, а, разам з тым, і ў справе камуністычнага выхаваньня шырокіх мас рабочае клясы** (гучныя воплескі).

Па Беларускае ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Уважліва разьмяркуем лес.

Магілеў, 26-9. На округу прызначана 180 тысяч кубаметраў лясных матар'ялаў, у тым ліку 72 тысячы для патрэб насельніцтва.

Сёлета пры разьмеркаваньні лесу паміж сялян трэба канчаткова зжыць былыя летась выпадкі, калі лес даваўся „усім пароўну", трэба здаволіць у першую чаргу беднату (а там, дзе лесу мала—толькі беднату) ды яшчэ правільна паказаць, хто—бядняк, серадняк, альбо заможны—атрымоўвае лес, бо сёлета ўпяршыню ўводзяцца гандлёвыя наддачы на таксу для серадняцкага і (вялікшыя) для заможнага сялянства.

У сувязі з апошнім (гандлёвай наддачай) заслугоўвае ўвагі прапанова некаторых сялян аб тым, што трэба ўважліва падыйсьці да прызначэньня лесу тым дваром, якія летась яго ня выкарысталі і перапрадалі (сёлета заможнік будзе асабліва імкнуцца да атрыманьня лесу праз падстаўных беднякоў).

Акрамя водпуску лесу на карню альбо ў парадку падбору буралому і ветравалу, сёлета арганізаваны па лясьніцтвах продаж як дроў, так і будоўных матар'ялаў у гатовым выглядзе—з часовых лясных складаў (у лесе). З гэтых часовых складаў можа забясьпечвацца і местачковае насельніцтва, якое тамака атрымае лес па ніжэйшых цэнах, чымся ў сталых лясных складах. Сталых лясных складаў арганізавана ў гарадох і мястэчках—12.

Як і летась, лясьніцтвам дадзена права даваць у парадку ачысткі ад павалу і хламу—50 процантаў скідкі супроць таксы.

Што зрабілі за самаабкладаньне.

ВОРША, 26-9. У вёсцы Рабцова, за сродкі самаабкладаньня адчынена школа, будынак для якой куплены за 450 руб. У школе ўжо распачаліся заняткі.

У вёсцы Затоны на пабудову новай школы адпушчана 370 руб. Сялянства прымае самы актыўны ўдзел у пабудове школы, каб ужо сёлета пабудаваць і адчыніць яе.

У вёсцы Зубаўня абапал вулі-цы пракопана канава даўжынёю ў 60 саж. У вёсцы Дубоўка пабудована два масты, пракопана 150 саж. канавы. У вёсцы Прыскаўка пабудованы 3 масты і ў вёсцы Слабадзе 1 мост.

У Славенскім с-с. на капітальны рамонт школы патрачана 602 руб. Куплены для пажарнай дружыны багры і бочкі на суму 157 руб.

Будуем заводы.

ГОМЕЛЬ, 25-9. Будаўніцтва на новым сельска-гаспадарчым заводзе праходзіць з посьпехам. Ужо скончана кладка цэглы ў адным з карпусоў, скончана кладка фундаманту двух карпусоў і пачата кладка цагляных сьцен. У зьвязку з узмацненьнем у Гомельшчыне цаглянага будаўніцтва адзяленьне Белдзяржстрою намячае пабудаваць у Гомелі цагельны завод, з выпрацоўкаю да 6 міліёнаў штук цэглы. Па зацьверджаньні ВСНГБ пляну заводу будзе распачата яго пабудова. На заводзе пабудаваны добрыя кватэры для рабочых. Маецца чырвоны куток.

БЕДНАТА АРГАНІЗУЕЦЦА.

ВОРША, 26-9. У верасьні месяцы сяляне в Воўкавіч, Талачынскага раёну склікалі агульны сход на якім галоўным пытаньнем было пастаўлена арганізацыя машыннага таварыства. На сходзе сваю згоду ўступіць у шэрагі таварыства заявілі 4 беднякі і 6 сераднякоў. Машыннае т-ва афармляецца ў раёне і хутка прыступае да працы.

КУЛАЧЧО НАСТУПАЕ.

БЫХАЎ, 26-9. Згарэў ад падпалу двор арганізатара с.-г. калектыву ў вёсцы Дубавое, бедняка-інваліда. У часе пажару чуваць былі кулацкія «спачуваньні»: «Вось табе калектыў і ўсё, хацеў отаць разумней за ўсіх»... У барацьбе з пажарам прымалі ўдзел амаль адны толькі сябры калектыву ды чырвонаармейцы, якія прыбеглі за 3 версты.

Трэба адшукаць і пакараць злачынцаў.

АРГАНІЗАВАЛІ КРЭДЫТНА-ГАСПАДАРЧАЕ Т-ВА.

Ворша, 25-9. У в. Доўгавічах, Расьнянскага раёну сяляне арганізавалі сельскае крэдытна-гаспадарчае таварыства, якое будзе абслугоўваць сялян: Асінаўскага, Забелоцкага, Доўгавіцкага і Пянькоўскага сельсавету. Сяляне чатырох гэтых сельсаветаў в вялікім здаваленьнем спаткалі арганізацыю т-ва і зараз з радасьцю кажуць:—мы маем права ганарыцца і шчыра дзякаваць уладу за гэта карыснае мера-прыёмства.

АЎТАМАБІЛЬНЫЯ КУРСЫ ПРАЦУЮЦЬ.

Бабруйск, 26-9. На арганізаваных пры Аўтадоры аўтамабільных курсах займаюцца 40 чалавек, выдзеленых ячэйкамі Аўтадору. Цяпер ужо прыступлена да практычных заняткаў—пробнай язды.

Па сканчэньні працы першага набору будзе зроблен новы набор курсантаў.

СТРЫМАЙЦЕ КУЛАКОЎ.

У вёсцы Добрыя Горы, Бешанковіцкага раёну, кулакі на чале з папом Кватюўскім прышлі ў кватэру камсамолкі Сафронавай, актыўнай бязбожніцы, і зьбілі яе да паўсьмерці за тое, што яна ня ахрысьціла свайго дзіцяці.

Віцебшчына.

АДРАМАНТУЙЦЕ МОСТ.

Каля пасёлка Замосьце, Кароткавіцкага сельсавету, па дарозе, па якой штодня езьдзіць шмат сялян, ёсьць невялічкі масточак.

Масток гэты зусім разваліўся. Бярвеньні пад нагамі каня раскатваюцца ўва ўсе бакі, таго і глядзі, што конь паламае ногі.

Сяляне гаворыць: лепш праехаць 10 вёрст, чымся раз пераехаць цераз гэты масточак, бо так растрасе, што ўсе вантробы перавернуцца.

Ну, а што робіць сельсавет, ці думае ён рамантаваць масточак?

Не. Ён чакае пакуль хто небудзь паламае на масту капю ногі ці зьверне сабе шыю.

Жлобінскі раён, Бабруйшчына.

СЕЛЬСАВЕТЧЫКАМ МЯМА ЧАСУ.

З вёскі Бацэвічы-Зарэчча на Ўсохі праходзіць дарога. Дарога знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы.

Адну частку дарогі Усохскі сельсавет адрамантаваў, а другую частку павінен быў адрамантаваць Бацэвіцкі сельсавет.

Але нашым сельсаветчыкам усё няма часу ўзяцца за рамонт дарогі, іх зусім ня турбуе тое, што людзі ня могуць праехаць па гэтай дарозе, ня рыбыкуючы застацца без каня ці калёс.

Клічаўскі раён, Бабруйшчына.

Акрэдраў, пратры вочы!

У сяле Боханах, Магілеўскай акругі, гр-н Міхаіл Якубаў Сьняткоў, не атрымаўшы ніякай мэдыцынскай адукацыі, вывучыўшы толькі на вайсковай службе санітарную справу, выдае сябе за фэльчара, ня маючы на гэта ніякіх дакумантаў. Ён дурманіць грамадзян, якія прыходзяць да яго за мэддапамогай. Калі самога Сьняткова няма дома, дык дапамогу аказвае яго жонка простая сялянка, брудными рукамі аглядае хворыя вочы і запускае лякарства, якое нападзецца ёй пад руку. Хвораму робіцца, зразумела, ня лепш, а горш і ён кідаецца за хуткай дапамогай у бліжэйшы мэдпункт. Мэдыцынскі пункт як відаць сьпіць і не праверыць Сьняткова, які зьяўляецца самазванцам. Нядаўна было паведамлена грамадзянамі сяла Баханаў, якія карысталіся лячэньнем Сьняткова і замест дапамогі адчувалі сябе горш. Аб гэтым грамадзяне паведамлялі Магілеўскі акруговы аддзел Аховы Здароўя, але чамусьці і да гэтага часу ніякія меры ня прыняты, а Сьняткоў і дагэтуль практыкуе. Калі прыходзіць бедны за дапамогай, тады ён кажа «ня маю часу, а калі хочаш атрымаць дапамогу, дык прыдзі да мяне папрацуй, а за лякарства заплаці». Калі-ж прыдзе багаты ды прынясе яйкі або кавалак сала ды самагонам напоіць, дык Сьняткоў такога ахвотна лечыць.

Да пабудовы халадзільніка.

Гомель, 25-9. Сельхарчпром распачаў пляніроўку плошчы для пабудовы халадзільніка. У будучым годзе будзе праведзена падрыхтоўчая праца, а ў новым будаўнічым сэзоне распачнецца пабудова халадзільніка. Сельхарчпром вядзе перамовы з праўленьнем Заходніх чыгунак аб правядзёньні чыгуначнага тупіку са станцыі Новабеліца да бойні. Пабудова тупіку будзе дапамагаць разьвіцьцю і пасылцы мясных прадуктаў, жывёлы і іншых тавараў, а таксама зьнішчыць непатрэбныя накладныя выдаткі.

За нескарыстаньне фондаў беднаты—пад суд.

Праўленьне Мазырскага Акрсельсаюзу, за нескарыстаньне фондаў па каапэраваньню беднаты, пастанавіла пераабрэць з аддачай пад суд праўленьні наступных каапэрацыйных аб'яднаньняў:

Прудкоўскай і Верасьніцкай малочных арцеляў, Пабудова - Чарэпіцкай арцелі, Асенскага і Рэмізаўскага машынных таварыстваў.

За бязьдзейнасьць у справе скарыстаньня фонду каапэраваньня беднаты будуць пераабраны праўленьні Галоўчаскага, Новасёлкаўскага, Чарнецкага насенных таварыстваў, м ашынага т-ва «Зорка» і Сярдзя-Рудзянскай малочнай арцелі.

За нянаўнае скарыстаньне памянёных фондаў праўленьне Мазырскага Акрсельсаюзу пастанавіла аб'явіць вымову з папярэджаньнем праўленьням Жыткавіцкага, Азарыцкага, Буйнавіцкага, Клесінскага і Пятрыкоўскага сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў.

Усімі памянёнымі арганізацыямі ня скарыстана фонду на каапэраваньню беднаты на суму 1564 руб. 84 кап.

Мазыр.

КАЛІ-Ж ДАДУЦЬ МАШЫНУ?

Па пляну Кармянскага райвыканкому, савгас імя Войкава павінен быў абмяняць сялянам не малую колькасьць сартавога жыта—2000 пуд.

Зразумела, што як надыйшла пара севу, дык сялянскія падводы пацягнуліся ў савгас.

Але-ж у савгасе—ні зярна. Жыта не абмалочана.

Хто-ж тут вінаваты?

Савгас загадзя, месяцы за два, выпісаў малатарню в Белсельтрэсту. Чакаюць-пачакаюць—малатарні няма. Паляцелі запытаньні—адно, другое, трэцяе, нарэшце—тэлеграма.

А Белсельтрэст адказвае гэтак спакойна:

— Дадзен нарад Цэнтраземскладу, апошнім малатарня ўжо выслана.

Але, відаць, машыну вязуць па валох, бо дагэтуль яе яшчэ няма.

А савгасу—хоць цапамі хлеб малаці. Бо малатарні, якія маюцца, не падыходзяць да рухавіка, за два дні іх растрапалі дзьве штукі.

Лічым, што Рабоча-Сялянская Інспэкцыя павінна адшукаць вінаватых.

Магілеўшчына.

Разгортваем працу.

Гомель, 26-9. На лесазводзе «Колтруд» праводзіцца ўзмоцненая праца па выкатваньню калод з возера. У лістападзе месяцы ў пачатку замярзаньня рэчкі, завод стане на 2 тыдні для бягучага рамонту. На рамонт будзе затрачана да 2 тысяч руб. Рабочыя лесапільнага заводу і стружачнага цэху атрымаюць чарговы двухтыднёвы водпуск. Бачарнае аддзяленьне заводу спыніць працу на 2-5 дзён.

Заводакіраўніцтвам распрацаваны праэкт пабудовы новай кузьні і пажарнага будынку. Гэтая пабудова будзе распачата ў пачатку кастрычніка, пасьля высьвятленьня пытаньня в плянаваньнем плошчы для новага камбінату.

Тураўскі райён---без агранома.

Якраз у самы разгар асеньняй пасеўнай кампаніі Тураўскі райён можа застацца без аднаго агранома.

А нядаўна іх было трое. Адзін з іх паехаў у доўгатэрміновую экспурсыю, другі прызываецца ў Чырвоную армію, а трэці задумаў вучыцца і таксама пакідае райён.

Мясцовыя працаўнікі прымаюць усе сілы каб мець хоць аднаго агранома.

А што скажа акруговы зямельны аддзел?

Мазыршчына.

ТДА-Авіяхім разгортвае працу.

ГОМЕЛЬ, 26-9. ТДА-Авіяхім разгортвае сваю працу. У ячэйках завяжваецца некаторае ажыўленьне. Арганізуюцца на прадпрыёмствах авіяхімканды, курсы па перападрыхтоўцы начскладу запасу, закладаюцца ў райёнах паказальныя вучасткі. ТДА-Авіяхім зараз пачаў падрыхтоўку да набору кандыдатаў у авіяцыйныя школы.

У райёнах і ў Гомлі арганізуюцца гурткі па падрыхтоўцы кандыдатаў у школы.

ТДА-Авіяхім прымае актыўны ўдзел у правядзеньні прызыву і спатканьні дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. У канцы верасьня ў райёнах будуць скліканы канфэрэнцыі дэмабілізаваных для прапрацоўкі пытаньня аб удзеле дэмабілізаваных у ваенізацыі насельніцтва.

СЕЕМ АЧЫШЧАНЫМ НАСЕНЬНЕМ.

Сяляне нашай вёскі Барсучына добра разумеюць карыснасьць пасеваў ачышчаным зярном. Сёлета перад пачаткам васеньняй сяўбы сяляне дагаварыліся і прывезьлі ў вёску трыер.

Праз трыер было прапушчана 150 пудоў жыта і 80 пудоў пшаніцы.

Амаль усе азімыя пасевы гэтай восеньню засеены ачышчаным насеньнем.

Сьвіслацкі раён, Бабруйшчына.

ШКОЛА Ў СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ АРЦЕЛЯХ.

Бабруйск, 26-9. З новага бюджэтнага году ў сельска-гаспадарчай арцелі «Зайнг» (Жлобінскі райён) адчыняецца школа, якая будзе працаваць на яўрэйскай мове. Школа будзе абслугоўваць тры яўрэйскіх сельска-гаспадарчых арцелі.

Бацькі пачалі ўжо рамантаваць памяшканьне, прызначанае пад школу.

Падатак паступае.

Згодна вестак, выканаьне с.-г. падатку на 15 верасьня г. г. па акрузе паступае:

Полацкі райён 7252 р., Лепельскі 7214 р., Вульскі 5885 р., Дрысенскі 4358 р. Вушацкі 8688 р., Расонскі 9230 р., Ветрынскі 8218 р. Валынецкі 8580 р. і Асьвейскі 7365 р.

Усяго с.-г. падатку выканана 41,4 проц.

КАЛДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ ПРАЙШЛА ЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Гомель, 26-9. Сёлета кампанія заключэньня калдагавораў на батракоў і пастухоў у акрузе прайшла здавальняюча. Калі ў мінулым годзе было ахоплена калдагаворамі 2500 чал., дык сёлета—5376 чалавек. Да 4000 батракоў былі застрахаваны. На жаль, страхавыя органы не падрыхтаваліся да ахопу такой колькасьці застрахаваных і ў выніку страхавыя органы ня справіліся з працаю па афармленьню страхаваньня батракоў. У сувязі з гэтым на спэцыяльнай нарадзе пастаноўлена ў відзе вопыту праводзіць сацстрахаваньне батракоў апаратам саюзу сельска-гаспадарчых рабочых.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІ КАНФЛІКТ У ГІСТАРЫЧНЫМ РАЗРЭЗЕ.

Зародак гістарычнага канфлікту між Літвою і Польшчай з-за тэрыторый, якія ніколі ня былі ні этнаграфічна-польскімі, ні этнаграфічна-літоўскімі, сягае канца 14-га стагодзьдзя (1386 г.), калі літоўскі князь Ягелла пасьля шлюбу з польскай каралевай Ядвігай аб'яднаў у сваіх руках уладу над Польшчай і Літвою. 1569-ы год канчаткова замацаваў унію Польшчы з Літвою, хоць акт гэты і адбыўся не без драматычных момантаў спраціву з боку літоўска-беларускай шляхты. Патроху, дзякуючы ўплывам розных гістарычных фактараў, ад роўнапраўнага саюзу Літвы з Польшчаю не засталося і цені, і Літва апынулася ў ролі звычайнай польскай правінцыі. У такім стане застаюць гістарычную Літву ўсе тры падзелы Польшчы; у такім-жа стане, але ўжо ў якасьці расейскай правінцыі, застаюць яе і паўстаньне 1863 году і абвешчаньне сваёй незалежнасьці Польшчай і Літвою—кожную паасобку—у 1918 годзе.

Страта гістарычнаю Літвою сваёй палітычнай самастойнасьці ня спыніла барацьбы як літоўскага, так і беларускага народаў за сваю самабытную культуру і палітычную незалежнасьць. Калі вярхі беларускай і літоўскай інтэлігенцыі патроху страцілі сваю нацыянальнасьць і спалёнізаваліся, дык затое гушчы народныя не паддаліся ні палёнізацыі, ні потым русіфікацыі.

Паўстаньне 1863 г., якое ішло на абшарах гістарычнай Літвы пад знакам польска-шляхецкім, дало ўсё-ж некалькі яскравых прыкладаў нацыянальна-рэвалюцыйнага беларускага і літоўскага руху, а гэта сьведчыць аб тым, што і літоўскі і беларускі народы, прайшоўшы праз шматвяковы палітычны, нацыянальны і культурны ўціск, ня страцілі ідэі сваёй былой незалежнасьці.

Паўстаньне 1863 г. скончылася для польскіх інтарэсаў на абшарах Літвы і Беларусі поўнай катастрофай. Расейскі ўрад пастанавіў зьнішчыць дашчэнту амаль ня ўсе праявы польскай культуры ў Літве. Трагічны для польскіх інтарэсаў сілёт выпадкаў зрабіў тое, што «паражка Польшчы стала пачаткам адраджэньня Літвы», як пажа Эразм Пільц у сваім артыкуле, зьмешчаным нядаўна ў «Слове» (№ 201).

У сьнежні 1863 г. агалошан быў указ Мураўёва, на аснове якога адабрана было ў польскіх абшарнікаў некалькі міліёнаў гэктараў зямлі. Штодня адбываліся кары сьмерцю і высылкі польскіх паўстанцаў; штодня абвяшчаліся канфіскацыі і кантрыбуцыі. Зачынены былі польскія газэты, часопісі, кнігарні, тэатры і таварыствы. З урадавых устаноў звольнілі амаль ня ўсіх палякаў.

Як-жа аднёсься расейскі ўрад да Літвы? Адносіны расейскага ўраду да Літвы былі зусім іншымі: ён, з аднаго боку, пачаў фаварызаваць ліцьвіноў, жадаючы перацягнуць іх на свой бок у барацьбе з польскімі мяцежнікамі. З гэтай мэтай літоўская мова была часткова дапушчана ў пачатковыя школы; утворана было некалькі літоўскіх настаўніцкіх сэмінарый; для літоўскай моладзі былі вызначаны стыпэндыі ў расейскіх унівэрсытэтах. З другога боку, расейскі ўрад ня спыніў у Літве сваёй русіфікатарскай палітыкі.

На культурнае разьвіцьцё літоўскага народу гэтая падвойная ігра расейскага ўраду не зрабіла вялікага ўплыву. Паблажкі літоўскі народ прымаў, не рабіў расейскаму ўраду няпрыемнасьцяй, але з лініі разьвіцьця сваёй уласнай культуры ня выходзіў.

Першыя крокі літоўскага пісьменства былі вельмі скромнымі: малітвенікі, катахізмы, календары, граматычныя падручнікі, зборнікі літоўскіх песьняў, кухарскія кніжкі—вось вынікі літаратурнай творчасьці тагочасных аўтараў. Піянэрамі нацыянальнай культуры было абмяжаванае кола людзей: Доўкант, Даўкша, Шлюпас і некалькі іншых. У пачатку культурны літоўскі рух ня меў яскрава выяўленых палітычных імкненьняў. Яго заданьнем было нацыянальнае і языковае адасабленьне ад польскіх уплываў.

Сьвядома палітычным становіцца літоўскі рух у часе японскай вайны і першай расейскай рэвалюцыі 1905 году. Тады яскрава выявіліся нясымпатыі нацыянальных літоўскіх колаў да ўсяго, што польскае. Прапагандыстамі рашучага антыпольскага напрамку былі сыны заможн-йшых літоўскіх сялян, студэнты Пецярбурскага і Маскоўскага унівэрсытэтаў. Адначасова з імі ішло пакаленьне літоўскіх ксяндзоў, якія да чыста палітычна-нацыянальных імкненьняў далучалі яшчэ жаданьне барацьбы на касьцельным грунце і праводзілі яе з заўзятасьцю. Абодвы літоўскія лягеры—сьвецкі і клерыкальны—вялі сваю акцыю паасобку, канкурыруючы паміж сабою і маючы свае асобныя таварыствы, газэты, часопісі, палітычныя і культурныя інстытуцыі. Найбольш дзейнымі агітатарамі літоўскасьці былі народныя настаўнікі.

Усе кірункі літоўскай палітычнай інтэлігенцыі выяўлялі пасьля рэвалюцыі 1905 году экспансыўныя імкненьні. І кансэрватары і радыкалы не згаджаліся ў сваіх пратэзіях на граніцы ў рамках этнаграфічных, а хацелі «Вялікай Літвы» ў межах б. губэрань: Ковенскай, Гарадзенскай, Віленскай і Сувальскай. Там сканструаваная Літва мела быць аўтанамічнай расейскай правінцыяй з законадаўчым соймам у Вільні. Так больш менш акрэсьліў сваю праграму кангрэс літоўскіх буржуазна-дэмакратычных груповак, які сабраўся ў Вільні ў лістападзе 1905 году. Наколькі к гэтаму часу літоўскі нацыянальны рух узрос, можна бачыць з таго, што на зьезьдзе гэтым было да тысячы дэлегатаў. Адначасова са зьездам была прынята гр. Віттэ ў Пецярбурзе дэлегацыя ўзяркованых літоўскіх груповак з праграмай, ідэнтычнай з праграмай зьезду. Праграму гэтую Віттэ загадаў выдрукаваць у «Правительственном Вестнике», што давала ёй як бы патэнт поўнай легальнасьці. Рэакцыя, якая наступіла ў Расеі пасьля 1906 году, прыдушыла праз некалькі гадоў нацыяльны літоўскі рух. Выбухнуў ён зноў з новай сілай у палове 1914 г., калі пачалася вялікая вайна.

Літоўскія палітыкі прызналі тады, што трэба зрабіць які-небудзь крок, які маніфэставаў-бы салідарнасьць літоўскага народу з Расеяй, якая фаварызавала літоўскі рух і выкарыстоўвала яго проці палякаў. 8 жніўня 1914 г. дэпутат Ічас абвясьціў у Думе «ад імя ліцьвіноў усіх партый» урачыстую дэклярацыю, што літоўскі народ, лёсы якога былі „заўсёды зьвязаны з лёсамі славяншчыны", ідзе на гэтую вайну, „як на сьвятую вайну", што «забывае ўсе крыўды ў надзеі, што ліцьвіны, раздзёртыя на дзьве часткі (у Прусіі і Расеі) будуць злучаны пад супольным расейскім сьцягам».

Настрой гэты хутка аднак зьмяніўся. У красавіку 1915 г. нямецкае войска прарвала расейскі фронт і акупавала Літву. Спачатку акупанты выдалі прызыву для польскіх інтарэсаў адозву аб польскасьці Вільні, якая канчалася словамі: «Няхай бог благаслаўляе Польшчу». Але гэты флірт трываў досыць карэтка. На зьмену яму ў хуткім часе прышоў флірт з ліцьвінамі. Склікана была з прадстаўнікоў розных палітычных груп «Краёвая літоўская рада» (Тарыба), у якой прынялі ўдзел і іншыя нацыянальнасьці краю, за выключэньнем палякаў. 11 сьнежня 1917 г. Тарыба прыняла дэклярацыю, якая выказвалася за «вечныя, моцныя саюзныя аднос

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

НАСТАЎНІЦТВА ПАВЯЛІЧАЕ ПАДПІСКУ.

Рэзалюцыя настаўніцкай канфэрэнцыі Чэрвенскага раёну. Прынята аднагалосна. Настаўнітва ў Чэрвенскім раёне 147 чал.

Улічыўшы карысьць доўгатэрміновай падпіскі і ўмовы 2-га конкурсу, канфэрэнцыя ўхваляе падпісацца ўсёму настаўніцтву Чэрвенскага раёну на газэту «Савецкая Беларусь» АЖ ДА 31 СЬНЕЖНЯ 1929 г., а таму даручае мясцкому правесьці пастанову ў жыцьцё.

Канфэрэнцыя лічыць неабходным на далейшы час БОЛЬШ УВАГІ ЗЬВЯРНУЦЬ НА СУВЯЗЬ НАСТАЎНІКА СА СВАЁЙ ГАЗЭТАЙ, асьвятляючы ў ёй сваё жыцьцё, працу і вопыт, таксама дасягненьні і недахопы савецкага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва раёну.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЗАКЛІКАЕ ЎСЁ НАСТАЎНІЦТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ СТАЦЬ ПАДПІСЧЫКАМІ І СУПРАЦОЎНІКАМІ БЛІЗКАЙ І ЗРАЗУМЕЛАЙ НАСТАЎНІЦТВУ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

„Ці хутка скончыцца ваша лекцыя?"

ХІБЫ ПРЫ ВЫКЛАДАНЬНІ ГРАМАДАЗНАЎСТВА.

У сучасны момант грамадазнаўства, як прадмет выкладаньня, аформілася; з яго зьместам згодны ў сваёй большасьці настаўнікі-грамадаведы, але на практыцы, па тых ці іншых прычынах, выкладаньне часта вядзецца ня так, як гэта было-б пажадана. У працэсе працы гуртка грамадаведаў гор. Менску выявілася, што некаторыя настаўнікі ня прытрымліваюцца стабілізаваных праграм па грамадазнаўству: зьмяняюць гэтыя праграмы па свайму погляду, запаўняюць гістарычным матар'ялам і сьвядома выкідваюць вельмі важныя моманты грамадазнаўчага зьместу, моманты, якія высьвятляюць сутнасьць клясавай барацьбы.

На гуртку грамадаведаў адзін настаўнік заявіў аб прахаджэньні ім у гэтым годзе імпэрыі Карла Вялікага, чаго, разумеецца, у нашай беларускай праграме няма. А такое пытаньне, як манастырскае земляўладаньне ў фэадальную эпоху Заходняй Эўропы, эксплёатацыя манастырамі сялян ён зусім выкінуў. На пытаньне, чаму манастырскі фэадалізм выкінут і не праходзіўся, «настаўнік-грамадавед» даў наступны адказ: «Бачыце, тут прышлося-б закрапуць ідэалёгію хрысьціянства, я гэтага не хацеў рабіць, і затым прышлося гэты момант прапусьціць».

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што ў нас яшчэ ёсьць «грамадаведы», якія, прыкрываючыся грамадазнаўствам, займаюцца ў сапраўднасьці прахаджэньнем гісторыі як гэткай. Гэта гаворыць аб тым, што некаторая частка настаўнікаў, выкладаўшы гісторыю ў старой школе па падручніку Ілавайскага, ня могуць да гэтага часу зразумець, што грамадазнаўства зьяўляецца ў сучасны момант такім прадметам, дзе чырвонай ніткай праходзе клясавая барацьба, на фактах якой выпрацоўваецца ў нашай моладзі марксысцкі сьветапогляд.

Другі факт, які заслугоўвае ўвагі, які таксама ўстаноўлен у працэсе працы гуртка грамадаведаў,—ізаляванасьць выкладаньня ад сапраўднага жыцьця. Былі выпадкі страшэннага абурэньня з боку, праўда, адзінак настаўнікаў на ўсялякія вылазкі са школы, як экскурсіі, правядзеньне грамадзка-карыснай працы і г. д.

Адзначалася тое, што гэтыя вылазкі сабе не апраўдваюць, што яны толькі адрываюць настаўніка і вучняў ад школьнай працы, што экскурсіі перашкаджаюць працы ўстановы, у якую робяцца гэтыя экскурсіі.

Гэты момант таксама падкрэсьлівае сабой напрамак, узяты некаторымі грамадаведамі на гісторыю, а не на грамадазнаўства, імкненьне да насыўных мэтадаў выкладаньня, да ізаляванасьці ад сапраўднага акаляючага жыцьця без экскурсіяў, грамадзка-карыснай працы і г. д. Гэта, вядома рэч, далёка не адпавядае тым мэтадам, якімі павінна выкладацца грамадазнаўства, і задачам, якія перад ім стаяць.

Трэцім адмоўным фактам, які мае месца пры выкладаньні грамадазнаўства, зьяўляецца сухасьць выкладаньня, што выклікае ў вучняў нуду, сапліваасьць і нездавальненьне прадметам. Вельмі часта чытаюцца лекцыі па грамадазнаўству бяз усякіх малюнкаў, не скарыстоўваецца мастацкая літаратура, якая магла-б захапіць і зацікавіць вучняў, прыкаваць іх увагу да гэтага прадмету. Ясна, што пры разумнай пастаноўцы працы ня было-б гамонкі вучняў паміж сабой у часе лекцыі, ня было-б з боку вучняў недарэчных пытаньняў да настаўніка накшталт такога, як—«ці хутка скончыцца ваша лекцыя?» (Так залуялі настаўнікі на занятках гуртка грамадаведаў).

Вядомая рэч, што цалкам адносьці гэтыя недахопы пры выкладаньні грамадазнаўства за кошт настаўніка нельга. Часта бывае так, што настаўнік пры ўсім сваім жаданьні (асабліва ў раённых сямігодках) ня можа знайсьці адпаведнага матар'ялу (мастацкай літаратуры, схэм, дыяграм і інш.), які можна было-б скарыстаць як падсобны матар'ял пры выкладаньні грамадазнаўства. Гэта, разумеецца, іншая справа. У гэтым настаўнік не павінен.

Л. Шашкоў.

Плянавасьць—на сталыя рэйкі.

(Бабруйшчына).

На адной з раённых настаўніцкіх канфэрэнцый Бабруйшчыны, якая адбывалася ў пачатку верасьня, акруговым інспэктарам Нарасьветы быў зачытан узоры арыентыровачны гадавы плян раскладу комплексаў для пачатковай школы. Плян гэты прапанавалася настаўнікам скарыстаць, як узоры, пабудаваўшы на грунце яго кожнаму настаўніку для сваёй школы ці груп падрабязны арыентыровачны і каляндарны плян. Прычым, акруговы інспэктар абяцаў, што ў самым хуткім часе да пачатку заняткаў у школах плян гэты будзе разасланы па раёнах, пасьля чаго раёны змогуць зараз-жа распаўсюдзіць яго па школах.

Бягуць дні... Набліжаецца тэрмін пачатку заняткаў у пачатковых школах, а пляну з акругі няма. Хвалююцца настаўнікі. Прайшло з часу абяцаньня да выкананьня яго 20 дзён і узоры плян дасхаў да раённаў. А заняткі ў пачатковых школах ужо тыдзень як пачаліся (15 верасьня). А да месца прыначэньня, да вясковых школ, узоры плян яшчэ тыдзень будзе ехаць. А там тыдзень пройдзе, пакуль, грунтуючыся на гэтым узорным пляне, кожны вясковы настаўнік складзе падрабязны гадавы арыентыровачны і каляндарны плян. Такім чынам, праз тыдні тры, а то і месяц з часу пачатку заняткаў у вясковых школах гадавы плян заняткаў можа і будзе складзены.

Б.

За грамадзка-паказальны суд.

На старонцы Асьветніка ад 18 верасьня (газ. „С. Б." № 215) была надрукавана заметка «Дэспатычных настаўнікаў—пад суд». Вядома, я ня буду бараніць памянёных там настаўнікаў і апраўдваць іх учынкі, калі гэткія мелі месца ў школе. Але гэткія факты кажуць аб слабай прафэсыйна-культурнай пэдагагічнай арганізацыі сярод настаўніцтва ў раёнах.

Дзе быў мясцком, дзе былі суседзі настаўніка, што ня чулі аб прыкрых учынках сваіх таварышоў у працягу году, а можа і некалькіх гадоў, і першы даведаўся і ўзьняў гэту справу начальнік пагранатраду?

У значнай меры вінаваты тут, такім чынам, прафарганізацыі і інспэктура, якія сваечасова не павялі культурнай барацьбы з падобнымі зьявішчамі, а дапусьцілі справу да судовага працэсу.

Цяпер гэта справа прыняла, памойму, таксама напраўільны напрамак, што памянёных настаўнікаў аддалі пад звычайны суд. Шмат большае значэньне, як для гэтых таварышоў, так і для іншых настаўнікаў, меў, бы паказальны грамадзка-таварыскі суд, які перавярнуў-бы іх усю псыхіку і паставіў-бы на здаровыя рэйкі іх пэдагагічную дзейнасьць. Звычайны-ж суд тут ня можа мець выхаваўчага значэньня для пэдагога, дзе справа разглядаецца, як звычайнае злачынства і будзе падведзена пад той ці іншы артыкул кодэксу аб пакараньні.

Тут злачыннасьць пэдагагічная, і пэдагагічна-прафэсыйны суд павінен судзіць. Прысуд гэтага суду быў бы маральна цяжэйшы для падсуднага і разам з тым быў-бы вельмі карысным.

М. Говар.

Адміністратарская цьвёрдалобасьць.

(Ветрынскі раён, Полацкай акругі).

Ветрынская адміністрацыя надзвычайна цьвёрдалобая, і калі што ўхваліць, дык уже нахай пярун б'е—ня зьменіць.

Так вышла пры ўкамплектаваньні школ на 1928-29 вучэбны год, калі дзесятка паўтара настаўнікаў перакінулі са старых месц на новыя.

Бязумоўна, тут справа не абыйшлася без скаргаў, просьбаў, прапаноў і апэляцый, але, на вялікі жаль, адміністрацыя не палічыла мэтазгодным прыняць гэта пад увагу.

Дзе там ужо слухаць пасобных настаўнікаў, калі саюз і той не бярэ на ўвагу (пратакол РКК адміністрацыя адмовілася падпісаць, бо там ня ўсё тое пацьвердзілі, чаго яна вельмі дабівалася).

У выніку вышла тое, што некаторыя настаўнікі, з працоўным стажам і скончыўшы пэдтэхнікум, пакінулі раён, а некаторыя—і настаўніцкую працу наогул.

Цяпер адміністрацыя ўкамплектоўвае школы курсантамі і вучнямі сямігодак (некаторыя нават на скончыўшы Полацкі пэдтэхнікум зьбіраюцца ехаць у Ветрынскі раён), а пра старых настаўнікаў іранічна кажа:

— Што-ж, паехалі і абыйдземся, толькі вытвар трэба паслаць.

Мо' адміністратары і абыйдуцца, але насельніцтву і рэспубліцы вялікая шкода.

Выгавар трэба зрабіць не таму, хто паехаў, а таму, хто прымусіў паехаць.

Пра гэту справу мы даводзілі да ведама Полацкага акруговага аддзелу асьветы і чакаем хутчэйшага адказу.

СЕЛЯНІН.

Што шкодзіць нармальнай працы школ.

(Буда-Кашалёўскі раён, гомельшчына)

Ад 15-га верасьня ў большасьці вясковых школ Буда-Кашалёўскага раёну распачаліся заняткі.

Наплыў дзяцей у першую групу, і наогул на ўсе групы, значна большы, чымся гэта было ў папярэднія гады: да гэтага часу ў некаторых школах раёну нагрузка на 20-25 проц. перавышае мінулы год. Але, ня гледзячы на значнае дасягненьне школы ў справе большога ахопу дзяцей, наша вясковая школа мае і адмоўныя бакі і перажывае некаторы крызіс, які перашкаджае вядзеньню рэгулярных заняткаў у парадку плянавасьці.

Першай і галоўнай перашкодай зьяўляецца заняжка з працай на полі, дзе дзеці нясуць некаторыя абавязкі па дапамозе бацьком і адрываюцца ад школы.

Падругое — адсутнасьць дармавых пісьмовых прыладаў для бедаты; у гэтай галіне трохі падкачаў РВК, які спазьніўся з закупкаў прыладаў.

Патрэцяе — поўная адсутнасьць пісьмовых прыладаў у нашых кіёсках «Кніга-вёсцы», якія не паклапаціліся аб тым, каб заўчас забясьпечыцца ўсім неабходным для школы.

Усё гэта разам узятае моцна б'е па школьных занятках.

Райвыканкому неабходна як найхутчэй накіраваць на вёску дармавыя пісьмовыя прылады і вучнёўскія лаўкі, а каапэратывы і кіёскам «Кніга вёсцы» забясьпечыць патрэбнай колькасьцю неабходных пісьмовых прыладаў.

Адначасова з гэтым неабходна па ўсіх школах наладзіць справу з вучнёўскімі каапэратывамі.

Гудок.

Аплата настаўніцтва на агульна-адукацыйных курсах ненармальная.

Разрыў наміж сямёхгодкаю і вышэйшаю школаю, з-за адсутнасьці патрэбнага ліку тэхнікумаў, прымусіў акр. інспэктуру Нарасьветы трымаць ужо сёмы год двухгадовыя агульна-адукац. курсы.

Недахоп сродкаў у акрана паставіў жыцьцё курсаў на ўласны каштарыс—самаакупату.

Такім чынам курсы ня толькі нічога нікому не каштуюць, а яшчэ іншы раз зьяўляюцца прыбытковаю крыніцай, бо ўсялякія астаткі, іншы раз значныя, забіраюцца акруговай інспэктурай і трацяцца на іншыя патрэбы. Каб забясьпечыць самаакупаемасьць курсаў, загадчыкі гэтых устаноў стараюцца набіваць вучнямі клясы да нельга. Так, у апошнім годзе на курсах у кожнай клясе каля 70 і звыш вучняў. Зразумела, што такі лік слухачоў не дае магчымасьці нармальна весьці працу і адбіваецца на якасьці яе, асабліва калі прыняць пад увагу, што памяшканьні, дзе адбываюцца заняткі, перагружаны школамі і зьменамі і ня маюць належнае вэнтыляцыі.

Аплата настаўнікаў за апошнія часы паставлена блага: напрыклад, за 16 тыднёвых гадзін (камплект) плацілася як у сямёхгодцы, ня гледзячы на тое, што ўмовы працы ў сямігодцы куды больш спрыяючыя, чымся на курсах.

Затое адміністрацыя курсаў атрымлівае як сьцед, а мо' і больш. За загад курсамі плацілася 22 гадз. арганізацыйных, каля 1 з паловай камплект, а намесьніку выдаецца цэлы камплект. Бязумоўна, гэта ненарміраваная аплата арганізацыйнымі гадзінамі павінна быць уведзена ў норму. Ю калі загадчыку сямёхгодкі за загад школай у 1000 вучняў, больш чым у два разы як на курсах, даюць адзін камплект, намесьніку—паўкамплекту, то на курсах гэта дапасаваць будзе і патрэбна і мэтазгодна.

Што тычыцца аплаты настаўнікаў, то пытаньне з аплатаю патрэбна ўпарадкаваць. Над гэтым пытаньнем трэба падумаць саюзу працаўсьветы і заключыць з камітэтам ўмову, якой за апошні час чамусьці не рабілася.

Настаўнік.

НОВЫЯ ФОРМЫ ВЫТВОРЧАЙ ПРАЦЫ НАСТАЎНІЦТВА.

Мэтадком Наркамасьветы БССР зьцьвердзіў новыя формы і вымест працы настаўніцкіх мэтадычных аб'яднаньняў.

Асноўнай формай вытворчай працы аб'яднаньняў прызнаны сэкцыі.

Па гораду Менску вызначаны мэтадычныя сэкцыі па антырэлігійнаму выхаваньню, палавому, вучнёўскаму самакіраваньню, піянэрруху і грамадзка-карыснай працы. Па Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай акругах будуць існаваць сэкцыі па антырэлігійнаму выхаваньню, вучнёўскаму самакіраваньню і грамадзка-карыснай працы.

Па Менску для кіраўніцтва мэтадычнымі сэкцыямі вызначаны высока-кваліфікаваныя пэдагогі.

НЕЗАКОННАГА ПЕРАМЯШЧЭНЬНЯ НАСТАЎНІЦВА НЕ ПАВІННА БЫЦЬ.

Нар. Кам. Працы СССР разаслаў усім Нар. Кам. Працы рэспублік цыркуляр, у якім прапануе ўзмацніць нагляд за правільным звальненьнем і перамяшчэньнем настаўніцтва. Нар. Кам. Працы БССР у сваёй дырэктыве інспэкцыям працы прапануе ў выпадках незаконнага звальненьня, альбо перамяшчэньня не абмяжоўвацца толькі адменай пастановы РКК, але паведамляць аб усіх такіх выпадках пракуратуру і РСІ.

ПРАЦА СЯРОД НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ.

ЯК ІДЗЕ КААПЭРАВАНЬНЕ.

(З пасяджэньня Нацкамісіі пры ЦВК БССР).

Па дакладах Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу аб каапэраваньні польскага і латыскага насельніцтва БССР Нацкамісія ЦВК БССР адзначае, што ні Белкаапсаюз, ні Белсельсаюз не вялі спэцыяльнага вучоту абслугоўваньня нацменшасьцяй; асаблівасьці жыцьця нацменшасьцяй таксама ня ўлічваліся і каапэраваньне нацменшасьцяй праходзіла без адпаведнага кіраўніцтва.

Нацкамісія ЦВК БССР даручае Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу ў далейшым для разьвіцьця і ўзмацненьня працы па каапэраваньні нацменшасьцяй наогул і ў прыватнасьці польскага і латыскага насельніцтва правесьці наступныя мерапрыёмствы:

Наладзіць сталы вучот працы па каапэраваньні нацменшасьцяй; пры правядзеньні працы па ўзмацненьні каапэрацыйнага будаўніцтва сярод нацменшасьцяй зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў каапэрацыйную працу нацменшаўскай беднаты і батракоў, палепшыць падрыхтоўку работнікаў з нацменшасьцяй; больш шырока ўцягнуць нацменшасьці ў кіруючыя каапэрацыйныя органы; прыступіць да выданьня адпаведнай каапэрацыйнай літаратуры на мовах нацменшасьцяй.

Адзначаючы вялікую зацікаўленасьць з боку нацменшасьцяй да калектыўных форм землякарыстаньня (арганізавана за апошні час каля 20 сельска-гаспадарчых польскіх калектываў, каля 60—яўрэйскіх), а таксама прымаючы пад увагу варожую дзейнасьць кулацкіх колаў супроць калектывізацыі, Нацкамісія пастанавіла даручыць Белсельсаюзу зьвярнуць асаблівую ўвагу як на ўзмацненьне ўжо існуючых калектываў, так і на арганізацыю новых.

Нацкамісія лічыць неабходным узмацненьне апарату Белсельсаюзу працаўнікамі, якія ведаюць быт і ўмовы асобных нацменшасьцяй дзеля лепшага абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй.

У ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ПРАЦУЮЦЬ ДОБРА.

Яшчэ ў зімовы час 1927 г. Акруговая Нацкамісія зьвярнула асаблівую ўвагу на вызваленьне яўрэйскіх мястэчак з таго цяжкага эканамічнага становішча, у якім гэткія часткова знаходзяцца і ў сучасны момант. Галоўнай мэтай у працы Нацкамісіі было пастаўлена: з наступленьнем вясеньняга і летняга часу прыступіць да зямляўпарадкаваньня і перасяленьня яўрэйскага насельніцтва.

Дзякуючы належнай увазе і зацікаўленасьці яўрэйскага насельніцтва, за кароткі час зямляўпарадкавана 1035 сем'яў, што складае прыблізна 9 проц. усяго яўрэйскага насельніцтва.

Разьвіцьцё яўрэйскага зямляўпарадкаваньня адбылося ў значнай меры за лік калгасаў.

Вылучана значная частка зэмфондаў унутры акругі для складаньня новых калгасаў; таксама прароблена праца па перасяленьню за межы акругі. Маюцца дасягненьні ў засяленьні калфондаў і ўпарадкаваньня м. Уваравічы, што дало магчымасьць разьвіваць саматужныя арцелі.

Трэба, каб райвыканкомы аказалі належную дапамогу ў абслугоўваньні яўрэйскіх калгасаў і стварэньні арцеляў. Калі будзе аказана агульная дапамога, то тыя мерапрыёмствы, якія намечаны, будуць выкананы.

Ня меншая зьвернута ўвага і на палянізаньне становішча польскага насельніцтва. Але-ж да гэтага часу гэта праца кульгала. У райёнах ня было ўпаўнаважаных, якія-б маглі абслугоўваць польнасельніцтва; недастаткова зварочалася ўвага на з'арганізаваньне калектыўных гаспадарак.

Турко.

Інсцэніроўка газавай атакі ў Менску.

МЕНСК АКАЗАЎСЯ ПАДРЫХТАВАНЫМ.

У тры гадзіны дня трывожна загудзелі фабрычныя і заводзкія гудкі. Шумны Менск заліўся прарывістымі гудкамі прадвесьнікаў „налёту".

Пешы, конны і аўтамабільны рух на Ленінскай і Савецкай вуліцах у працягу 5-ці хвілін зьнік. Куды падзеліся тысячы пешаходаў, куды зьніклі сотні легкавых звозчыкаў, куды прапалі дзесяткі аўтабусаў?

У паветры зашумелі прапэлеры авіяцыйных зьвеньняў; з бальконаў затрашчалі кулямёты, на Пляцу Волі пачалі рвацца «хімічныя» бомбы.

Са ўсіх завулкаў шалёным тэмпам імчаліся пажарныя аўта-машыны з камандамі ў супрацьгазавых масках.

Уміг пустыя вуліцы і Пляц Волі ператварыліся ў пекла грукату, суматохі авіяхімаўскіх каманд і мора «атрутных газаў».

Па вуліцах загудзелі былыя аўтабусы, а цяпер—санітарныя аўтамабілі, падбіраючы па дарозе «атручаных» грамадзян.

«Загараўся» будынак Акрвыканкому. Бомба, кінутая «варожым» авіятарам, папала ў самы дах. З вокан пачалі высоўвацца агнёвыя языкі. Уміг каля будынку апынуліся пажарныя аўтамашыны. Запрацавалі іх маторы. Брандзбоі з трэскам пачалі заліваць «агонь». Пажарнікі ў масках апынуліся на страсе будынку.

Кожны атрад авіяхіму, кожная яго каманда, кожны пажарнік, кожны грамадзянін меў і ведаў сваё месца.

Так Менск «абараняўся» ў працягу цэлай гадзіны. Упартая, дружная была абарона. Яна паказала, што праца ТДА-Авіяхіму дарма не прападае; што гэта праца стаіць на належнай вышыні і дае савецкаму грамадзянству неабходнае на выпадак нападу ворага.

С. Азэрскі.

ПРАЦА ТДА-АВІАХІМУ—НА ВЫШЫНІ.

Учора, 26 верасьня, а 3-й гадзіне дня Менск атакавалі «варожыя» самалёты.

Як толькі на небасхіле паявіліся плямі наближаючыхся самалётаў, дазорцы адразу паведамілі аб небясьпецы. Раптам загучэлі гудкі на заводах.

Зараз-жа зьявіліся на вуліцах атрады ТДА-Авіяхіму, мэдыцынскіх ossьцёр і санітараў. Насельніцтва пачало палахліва хавацца і пазачыняла вокны і брамы. Вуліцы—Энгельса, Ленінская і Пляц Волі, на якія, па ўсіх меркаваньнях, была накіравана «атака», хутка апусьцелі.

Тым часам, усё хутчэй набліжаўся шум самалётаў. Паветра раптам усхалыхнуў кулямёт, на заклік якога пачалі страляць і ў іншых месцах.

У той час, як самалёты цэлай плоймай набліжаліся да гораду, атрады ТДА-Авіяхіму ўжо зьявіліся на зборны пункт, ладзячы процівагазы ды іншыя прылады супроць атрутных газаў.

Раптам: Бах! Бах!

Гэта пачалі рвацца бомбы, якія былі скінуты самалётамі на вуліцы Энгельса і Пляцу Волі.

Атрады ТДА-Авіяхіму і санітары рынуліся ў атручаныя райёны, набягу нацягваючы маскі.

Конныя міліцыянэры ў масках (на коннях нысах таксама былі «маскі») разъяжджалі па вуліцах і трымалі сувязь з атручанымі райёнамі.

Выбух агню ў панадворку Дому Чырвонай Арміі выклікаў новую небясьпеку. Зараз-жа зьявіліся пажарнікі, якія пачалі дружна заліваць „пажар". Пажарныя часьці сталі напагатове і на іншых вучастках «небясьпечнага» райёну, каб своечасова затушыць пажар, які маглі выклікаць „варожыя" бомбы.

Своечасова ўжытыя меры і вытрымаласьць санітарных і хім-атрадаў далі магчымасьць безперабойна праводзіць работу па зьнішчэньню „атрутных" газаў і дапамагаць «атручаным».

«Атручаныя» своечасова былі дастаўлены ў больніцу.

Агульнымі высілкамі паветраны «налёт» быў адбіты.

Пад шаўкоўніцтва трэба падвесьці эканамічную базу.

Яшчэ ў 1925 годзе на агульным сходзе прыродазнаўчай сэкцыі Інбелкульту быў заслухан цікавы даклад дацэнта БДУ тав. Н. Зьбіткоўскага аб шаўкоўніцтве ў Беларусі.

Справа гэта тады абмежавалася кароценькай заметкай у газэце. Трудна было ў той час спадзявацца чагосьці большага.

Пасьля гэтага прайшло ўжо некалькі год. Дацэнт Н. Зьбіткоўскі, замкнуўшыся ў сваёй дамашній, цеснай лябараторыі, амаль бяз ніякай дапамогі робіць вопыты са сваімі шаўковічнымі вусенямі.

У працягу гэтага часу ў некаторых газэтах зьяўляліся ўжо больш паважныя артыкулы, якія даводзілі на фактах магчымасьць арганізацыі ў БССР шаўкаводнай справы.

Нам ня трэба даводзіць карысьці гэтай важнай справы для нашай прамысловасьці і для дабрабыту жыхарства. Карысьць гэта ўсім вядома.

Аднак, пакуль што надта рэальных крокаў, апроч дацэнта Н. Зьбіткоўскага, у справе дасьледваньня шаўкаводнай справы ніхто на робіць.

Чым гэта можна тлумачыць?

На падставе дакумантаў на гэтае пытаньне адказаць цяжка, бо ні справы, ні дакумантаў пакуль што няма.

Мы падыходзім да справы проста: **ці цікавіцца Інбелкульт шаўкоўніцтвам на Беларусі?** Соромна было-б адказаць, што Інбелкульт гэтаю справаю ня цікавіцца. Аднак чамусьці ён не дапамагае.

ВСНГБ, які глядзіць на рэчы з пункту гледжаньня рэнтабельнасьці, ня маючы на такія вопыты адпаведных сродкаў, узбудзіў хадайніцтва перад СНК аб водпуску 500 руб. Інбелкульт-жа і Беларускі Дасьледчы Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, якія маюць сродкі на дасьледваньне ўсіх галін сельскай гаспадаркі і якія ў сілу сваё мэтавай устаноўкі, павінны гэтым займацца, абходзяць справу моўчкі і не дапамагаюць зацікаўленым дасьледчыкам.

С. А.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ Ў НАРАЎЛЯНШЧЫНЕ.

Толькі ў гэтым годзе зямляўпарадкаваньне ў Нараўляншчыне (Мазырская акруга) зварухнулася з мёртвай кропкі. Напрыклад, яшчэ ў мінулым годзе ў райёне працаваў толькі адзін каморнік. Сёлета іх працавала 7 і маюцца вынікі.

За лета разьмерана плошча ў 6042 гэктары, на якой мяркуецца пабудаваць 19 пасёлкаў з агульнаю колькасьцю ў 287 двароў, ці ў сярэднім па 15 двароў на пасёлак.

Таксама хутка кончыцца афармленьне Вуглоўскіх пасёлкаў, разьмяркоўваюцца для зямляпадзяленьня Карпавіцкі луг і ўрочышча Дзямідава; усяго з плошчаю ў 2121 гэктар.

Зямляўпарадковываючымся бядняцкім гаспадаркам адпушчана 4500 рублёў крэдыту.

У праходзячую асеньнюю кампанію сяляне сеялі ўжо на шырокіх палосах.

Разам з тым зямляўпарадкоўваюцца тры калгасы.

Мазыршчына.

ПА ПОЛАЧЧЫНЕ.

(Уражаньні).

У дарозе.

Са станцыі Менск мяне праводзіў мой добры знаёмы і прыяцель бяспрытульнік Сашка Міжнародны. Такую клічку яму далі таварышы затым, што ён нібы пабываў заграніцай бяз пашпарту і бяз білету. Перад ад'ездам Сашка даваў мне даволі арыгінальнае настаўленьне:

— Раз ты едзеш у вялікую дарогу, дык не бяры ніякіх рэчаў.

Я, па праўдзе, зьдзівіўся такой заяве і намякнуў, што вось у дарозе захочаш часам памыцца, або кашулю зьмяніць, дык зусім бяз рэчаў ехаць, неяк не пасуе,—дзе даставаць будзеш.

— Кашуля—глупства,—аўтарытэтна зазначыў Сашка,—вось на мяне паглядзі—ніякай абузы.

І праўда, калі Сашка раскінуў пяпвыразнага колеру балахон, я ўбачыў голае цела, не абсалютай чыстаты:

— А калі часам, што і трэба будзе—прадаўжаў Сашка,—дык у дарозе заўсёды дастанеш, толькі зяваць ня трэба. А набярэш многа рэчаў, напэўна сапруць.

Мой прыяцель Сашка—перакананы вораг чужой уласнасьці, дзеля гэтага я не дыскусаваў па ўзьнятаму ім пытаньню; рацыянальна браць у вялікую дарогу рэчы, ці не. Але, калі ён прапанаваў мне аднесьці мой клумак назад па кватэру, я, хоць Сашка і добры мой прыяцель, катэгарычна адмовіўся. Гэта выклікала яўнае нездаволеньне Сашкі, якое пагражала перайсьці ў адкрыты разрыў. Пягадзіліся мы на тым, што я «пазычыў» Сашку залатоўку і тады ён як-бы ў развазаньні дадаў:

— А, зрэшта, у цябе не такі ўжо вялікі клумак... можа і не ўкрадуць.

На гэтым мы і памірыліся.

Пад апошнія настаўленьні Сашкі і яго разьвітальны сьвіст кур'ерскі цягнік плаўна адышоў ад станцыі, мінуў скупа асьветленыя гарадзкія ваколіцы і, паступова набаўляючы ходу, шалёна панёсься ў чорны правал мокрай асеньняй ночы.

Заўсягдышняя пры адходзе поезду суталака ў вагонах уляглася; кожны знайшоў месца і сабе і рэчам. Пачаліся звычаўныя ў пачатку дарогі гутаркі: «Вы ў Маскву? Я таксама». «Я вас недзе спатыкаў». «Спрабуйце групы». Так пачынаюцца знаёмствы на ўсю дарогу. Новыя прыяцелі частуюць адзін аднаго піражкамі, карыстаюцца адным чайнікам, апавядаюць падрабязна аб жыцьці сваім і ўсіх сваіх родных і знаёмых:..

Тры гадзіны язды—і мы ў Ворпы. Аршанскі вакзал гасьцінна спатыкае пасажыраў сваім чыстым, толькі што адрамантаваным памяшканьнем. Прысмна адзначыць, што цяпер ужо вакзал ня рэжа вока сваімі «классами», рамонт скасаваў вакзальныя клясы і па форме.

У Ворпы я пераканаўся ў практычнасьці майго прыяцеля бяспрытульніка Сашкі, які раіў мне ня браць у дарогу ніякіх рэчаў. Бесплацкартныя вагоны ленінградзкага поезду тут бярэцца з бою. Чыгуначная адміністрацыя пакуе ў гэтыя вагоны людзей «да адказу». Ня дзіва, што пасажыры з вялікім багажом мусяць разьвіваць найбольшую актыўнасьць каб уціснуцца ў вагон. Вось тут і вынікаюць непаразуменьні. Калі мы шчыльнай сьцяной ішлі на вагон, па магчымасьці трымаючы чаргу ў цёткі, абчэпленай шматлікімі клумкамі і пакунчакамі, папёрлі адзін з клумкаў. Праўда, грамадзянін—экспрапрыятар, якога мы тут-жа затрымалі, аказаўся на радкасьць джэльтмэнам. Ён бяз жадных спрэчак аддаў клумак і нават папрасіў прабачэньня, што памыліўся. Але гэта здарэньне ўнесла некаторы разлад у стройную чараду, і частка грамадзян выкарыстала момант да жудасьці эгаістычна; яны бяз усякае чаргі ўпёрліся ў вагон і пазаймалі лепшыя месцы.

А ў вагоне мімаволі ўспамінаецца 24-25 гады, калі па нас напала, неўласьцівая нам, нейкая эпідэмія чыстаты. У тыя гады праваднік гагону штрафаваў на тры рублі, нават за выпадкова кінуты акурак на падлогу. Але гэта бацыла чыстаты, хоць і шчыра прышчэпілася чыгуначнай адміністрацыяй, ня прынялася; яна, відаць, зусім чужая нашаму арганізму. Вагоны цяпер завіданы ня толькі акуркамі, але і ўсёй тэй шумай, якой так багат бесплацкартны пасажыр дальняга руху.

У Віцебску зноў успомніў свайго прыяцеля-бяспрытульніка. Не абцяжараны багажом, я за 15 хвілін пасьпеў і білет узяць, выпіць шклянку гарбаты і сесьці ў поезд у той момант, калі ён пачаў кратацца. Тут з бою вагонаў ня трэба браць, хоць і цеснавата ехаць.

Паплылі гарадзкія ваколіцы, старэнькія халупкі, багатыя агароды, сады. Дзьвіна бліскучай срэбнай стужкай уецца між чыстых пяскоў. Спачатку яна ідзе поплеч з чыгункаю, потым адыходзе ўправа і хаваецца ў сухіх полацкіх барох.

Прыгожыя полацкія краявіды. Дробныя вёскі і хутары мяжуюцца з цёмна-зялёнымі барамі. Поезд імчыць то па глыбокіх прарэзах ва ўзгорках, то раптам выбягае на высокую насыпь і ідзе па самым беразе чыстага возера. Што ні кілёмэтр, то новы від, новае ўражаньне для вока. Цяжка адарвацца ад гэтага калейдаскопу фарбаў, сьвету і формы...

У нашым вагоне чалавек 20 звыш нормы. Едуць прыгарадныя сяляне, служачыя, дарожныя рабочыя, панны і інш., а каля паловы ўсіх едучых—віцебляне, якія накіроўваюцца ў Полаччыну за брусьніцамі. Самыя шумныя пасажыры ў нашым купэ-селяніх Валынецкага райёну і прараб з «Дзьвінаўлесу». Прараб, мусіць, пяты раз пачынае апавядаць аб нейкай несправядлівасьці, з прычыны чаго яго аддаюць пад суд.

— Хіба-ж я растраціў? Ну, скажэце, зьвярнуўся ён да мяне, магу я растраціць, ці не?

Я нешта такое нагаварыў наогул аб растратах, потым асьцярожна зазначыў, што бывае—людзі некаторыя і растрачваюць, а аднесна таварыша-прараба я катэгарычна заявіў, што ён растраціць ня можа ні ў якім разе.

— Твар, кажу, у вас, не такі, каб растрачваць.

— Праўда, у мяне твар благародны, згадзіўся прараб і, паглядзеўшы на мяне, больш даверліва пачаў скардзіцца, што на яго ўзводзяць другую напрасьліну.

— Мяне вінавацяць, што я прапіваў казённыя грошы, а я і смаку гарэлкі ня ведаю. Далі-бог, ня п'ю!.

Але тут мы, ня гледзячы на ўсю нашу даверлівасьць, ніяк не маглі паверыць у цьвярозасьць прараба. Сіня-чырвоны прарабаўскі нос выдаваў, гад, з галавой свайго гаспадара і яго блізкае знаёмства з Бахусам.

Пачатая гутарка аб трэзвасьці натуральна перайшла ў шырокую дыскусію па пытаньнях п'янства наогул. Мы гэта пытаньне абмеркавалі са ўсіх бакоў, выказаліся проці контра, падвялі, канешна, эканамічны базіс пад п'янства, „пакрылі" спадчыну царызму і асудзілі гарэлку на канчатковую пагібель.

Больш ад усіх гарачыўся і крычаў шумны селянін з Валынецкага райёну. Ён нападаў на гарэлку і асабліва на самагон са ўсёй сілай сваёй гарачай натуры. Шкадлівасьць ужываньня алкаголю ён падмацоўваў лічбамі і фактамі.

— Наша вёска, Шайтрава, казаў ён, прапівае штогод сотні пудоў хлеба, а школу мы будуем вось ужо тры гады. І самім грэх і людзям сьмех. Каб тое, што прапіваем, ды пусьціць на школу, мы-б яе ў два тыдні адбудавалі.

Дзядзька быў да таго абуран, што мы яму паспачувалі зусім шчыра і тут-жа пагалоўна ўсе заразіліся яго ненавісьцю да гарэлкі.

У канцы дыспуту мы вынесьлі аднагалосна рэзюмэ: ужываньне алкаголю ёсьць вялізнае зло і яго трэба

2-я пазыка індустрыялізацыі — пазыка працоўных сваёй дзяржаве. Падпісацца на пазыку — абавязак працоўных.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі

ПА ДАКЛАДУ АБ ВЫДАНЬНІ ТВОРАЎ ЛЕНІНА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, заслухаўшы даклад тав. Ігнатоўскага аб працы Камісіі па выданьні твораў У. І. Леніна ў беларускай мове, адзначае найважнейшае палітычнае і культурнае значэньне гэтага выданьня. З выхадам з друку твораў Леніна ў беларускай мове найшырэйшыя працоўныя масы атрымоўваюць магчымасьць аўладаць неабходнай у сацыялістычным будаўніцтве ленінскай тэорыяй у роднай мове. Гэта тэорыя будзе тою асновою, на якой будуць мець найлепшую магчымасьць вырастаць новыя кадры кіраўнікоў і працаўнікоў сацыялістычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва з нізоў беларускага рабочага і сялянскага насельніцтва. Творы Леніна на беларускай мове, акрамя значнага ўзбагачэньня і ўдасканаленьня агульнай тэрміналёгіі, даюць грунтоўную навукова-прапрацаваную і вывераную маркасыцкую тэрміналёгію, якая закладвае моцны фундамант для далейшай навуковай маркасыцкай работы ў беларускай мове і далейшай беларусізацыі ўсіх і асабліва вышэйшае асьветы краю.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускае ССР, выходзячы з гэтага, **пастанаўляе:**

1. Лічыць патрэбным закончыць выданьне 12 томаў твораў Леніна да 60-годзьдзя са дня нараджэньня Леніна, гэта значыць да 1930 году.

2. Усю работу і надалей яшчэ больш шчыльна кантактаваць з навуковай работай Ленінскага Інстытуту і рэдакцыямі па выданьні твораў Леніна ў іншых найважнейшых мовах (украінскай, нямецкай і г. д.).

3. Даручыць Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР прыняць усе меры да інтэнсыўнага ходу работы Рэдакцыйнай Камісіі, забясьпечыўшы яе ў поўнай меры патрэбнымі сродкамі і навуковымі работнікамі і ўтварыўшы ўсе матар'яльныя ўмовы для іх найбольш прадукцыйнай працы.

4. Даць дырэктыву на месцы аб прыцягненьні ўсіх савецкіх арганізацый да справы папулярызацыі і распаўсюджваньня твораў Леніна сярод працоўных мас горада і вскі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

20 верасьня 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета Белорусской Социалистической Советской Республики

ПО ДОКЛАДУ ОБ ИЗДАНИИ ПРОИЗВЕДЕНИЙ ЛЕНИНА НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ.

Центральный Исполнительный Комитет Белорусской Социалистической Советской Республики, заслушав доклад тов. Игнатовского о работе Комиссии по изданию произведений В. И. Ленина на белорусском языке, отмечает весьма важное политическое и культурное значение этого издания. С выходом из печати произведений Ленина на белорусском языке широчайшие массы трудящихся получают возможность овладеть на родном языке необходимой в социалистическом строительстве ленинской теорией. Эта теория явится тем основанием, на котором будут иметь наилучшую возможность вырастать новые кадры руководителей и работников социалистического, хозяйственного и культурного строительства из низов белорусского рабочего и крестьянского населения. Произведения Ленина на белорусском языке, кроме значительного обогащения и усовершенствования общей терминологии, дают основательную научно-проработанную и выверенную марксистскую терминологию, закладывающую прочный фундамент для дальнейшей научной марксистской работы на белорусском языке и дальнейшей белоруссизации всего и особенно высшего образования края.

Центральный Исполнительный Комитет Белорусской ССР, исходя из этого, постановляет:

1. Считать необходимым закончить издание 12 томов произведений Ленина к 60-тие летию со дня рождения Ленина, т. е. к 1930 году.

2. Всю работу и в дальнейшем еще более тесно увязывать с научной работой Ленинского Института и редакциями по изданию произведений Ленина на других важнейших языках (украинском, немецком и т. д.).

3. Поручить Президиуму Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР принять все меры к интенсивному ходу работы Редакционной Комиссии, обеспечивая ее в полной мере необходимыми средствами и научными работниками и создав все необходимые материальные условия для наиболее продуктивной работы их.

4. Дать директиву на места о привлечении всех советских организаций к делу популяризации и распространения произведений Ленина среди трудящихся масс города и деревни.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

20 сентября 1928 г.
г. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі

АБ ВЫКАНАНЬНІ ДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ БССР ЗА 1926-27 ГОД.

Заслухаўшы справаздачу Савету Народных Камісараў аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1926-27 год, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі пастанаўляе:

Пастанову Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР за 24-е траўня 1928 году па дакладу аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1926-27 год зацьвердзіць.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

23 верасьня 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета Белорусской Социалистической Советской Республики

ОБ ИСПОЛНЕНИИ ГОСУДАРСТВЕННОГО БЮДЖЕТА БССР ЗА 1926-27 ГОД.

Заслушав отчет Совета Народных Комиссаров об исполнении государственного бюджета БССР за 1926-27 год, Центральный Исполнительный Комитет Белорусской Социалистической Советской Республики постановляет:

Постановление Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР от 24 мая 1928 года по докладу об исполнении государственного бюджета БССР за 1926-1927 год утвердить.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

23 сентября 1928 г.
г. Минск.

Правядзеньне „Дню Ўраджаю"

ПА МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

Акруговая камісія выпрацавала плян правядзеньня «Дню Ўраджаю» па Менскай акрузе.

Сёлета сьвяткаваньне «Дню Ўраджаю» будзе праходзіць пад знакам прапаганды падняцьця ўраджайнасьці тэхнічных і зорнавых культур, шырокага растлумачэньня аб разьмерах дапамогі савецкай улады бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам і вынікі гэтае дапамогі. Апрача гэтага, сёлета ў час сьвята „Ураджаю" будзе шырока папулярызавацца значэньне ТДА-Авіяхіму ў справе падняцьця культурнасьці і інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

13 кастрычніка намечана правесьці ва ўсіх райвыканкомах урачыстыя пясяджэньні з удзелам партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый, на якіх будуць адзначаны дасягненьні бягучага сельска-гаспадарчага году.

14 кастрычніка ва ўсіх раёнах будуць наладжаны раённыя сельска-гаспадарчыя выстаўкі, а дзе магчыма і падрайённыя выстаўкі.

Увечары 14 кастрычніка мясцом запрапанавана наладзіць інсцэніроўкі, агранамічныя суды, ушанаваньне прыкладных бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, а таксама прыкладных пасёлкаў і калектываў.

Па раённых шэфскіх т-вах гораду Менску запрапанована правесьці сходы шэфарганізацый, на якіх зрабіць даклады аб удзеле шэфарганізацый у сьвяткаваньні.

Апроч гэтага шэфарганізацыям запрапанавана правесьці кампанію за збор неабходнай літаратуры для вёскі, а таксама адшукаць сродкі для ўстаноўленьня прэміі „Імя шэфарганізацыі".

Па лініі ТДА-Авіяхіму на раённых выстаўках сельскае гаспадаркі будуць арганізаваны куткі ТДА-Авіяхіму. На двух раённых выстаўках будуць выдадзены па адной прэміі „Імя ТДА-Авіяхіму".

У час «Дню Ўраджаю» будуць арганізаваны экскурсіі батракоў, батрачак і рабочых савецкіх гаспадарак на выстаўкі.

Апрача гэтага, па савецкіх гаспадарках будуць праводзіцца сходы, дзе будуць наладжаны ўрачыстыя ўшанаваньні больш старанных рабочых з выдачаю ім прэмій за кошт гаспадарак.

Па лініі ЛКСМБ у часе сьвята „Дню Ўраджаю" будуць праведзены канфэрэнцыі па раёнах па агранамічных пытаньнях.

Палітасьветным установам запрапанавана прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні „Дню Ўраджаю".

Папраўка.

У № 222 нашай газэты (за 26 верасьня г. г.) у артыкуле—«НА ШЛЯХОХ ДА СТВАРЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ОПЭРЫ» ПА НЕДАГЛЯДУ КАРЭКТУРЫ дапушчана грубая памылка. У 3-м слупку сказу (4-ты рад. зьверху), які пачынаецца словамі—«Такім чынам, калі музычнае выхаваньне»..., пасьля слоў—... „якія на працягу некалькіх гадоў калечылі правільную лінію музычнага выхаваньня ў музтэхнікуме" ПРАПУШЧАНЫ СЛОВЫ— „І ЯКІХ, НАРЭШЦЕ, ПАЧЫНАЮЦЬ ВЫМЯТАЦЬ АДТУЛЬ".

ХРОНІКА.

Культурны паход піанэраў.

З 1-га па 15-га кастрычніка будзе праводзіцца культурны паход піанэраў. Арганізуецца штаб кіраўніцтва. Пры базах і райпіанэр-бюро арганізуюцца свае штабы па правядзеньні паходу ў складзе прадстаўнікоў піанэраў, камсамолу, народнае асьветы, бацькоў і г. д.

Для падрыхтоўкі да культурнага паходу ва ўсіх атрадах і школах да 1-га кастрычніка будуць праведзены гутаркі аб значэньні паходу. Да ўдзелу ў паходзе прыцягваюцца і школьнікі. Кожная школа ў працягу тэрміну культурнага паходу арганізуе свае культвечары. У школах будуць арганізаваны гурткі дапамогі адстаючым дзецям у вучобе. Будзе праведзена кампанія за разумнае выкарыстаньне перапынкаў.

Як праходзяць хлебазагатоўкі.

Па вестках Нар. Кам. Гандлю БССР з пачатку хлебазагатоўчай кампаніі на 20-га верасьня загатоўлена па БССР 6220 тон розных хлебапрадуктаў. У мінулым годзе за гэты-ж час было загатоўлена 376 тон.

З гэтых лічбаў відаць, што пакуль-што хлебазагатоўкі па БССР праходзяць пасьпяхова.

Колькасьць сельска-гаспадарчых калектываў расьце.

Калянктыўнае будаўніцтва па БССР разгортваецца буйным тэмпам. Так, калі на 1 кастрычніка 1927 г. было па БССР 416 калгасаў, дык зараз ужо налічваецца 766 калгасаў.

10 кастрычніка склікаецца ўсебеларускі зьезд калгасаў, дзе будзе абгавораны цэлы шэраг пытаньняў аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Капітальнае будаўніцтва ў спажывецкай кааперацыі.

Белкаапсаюз выпрацаваў плян капітальнага будаўніцтва на 1928-29 г. па спажывецкай кааперацыі. У сельскіх мясцовасьцях намячаецца пабудаваць звыш 100 крам. Сетка гарадзкіх магазынаў будзе пашырана на 150 адзінак. Апрача гэтага ў 1928-29 гаспадарчым годзе намячаецца абсталяваць у райёне кожнага райсаюзу па адной культурнай чайнай.

Пажарныя каманды будуць працаваць у 3 зьмены.

Да гэтага часу Менскія пажарныя дружыны працавалі ў 2 зьмены.

Нар. Кам. Працы БССР пастанавіў з 1 кастрычніка перавесьці ўсю працу пажарных каманд на 3 зьмены.

Новыя лікпункты.

Цэнтральнае праўленьне саюзу камунальнікаў пастанавіла арганізаваць у бягучым вучэбным годзе пры саюзе два лікпункты для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод сяброў саюзу.

Усяго ў гэтыя лікпункты будуць прыняты каля 80 чал.

Грамадзкія работы па Менску.

Камунальная сэкцыя Менскага гарсавету зацьвердзіла плян грамадзкіх работ на 1928-29 г.

Па гэтаму пляну на будучы гаспадарчы год мяркуецца выдатковаць на грамадзкія работы па Менску 315000 р.

Экспартныя навіны.

Экспарт рызьля.

За апошнія два тыдні Белдзяржгандаль паслаў значныя партыі розных відаў рызьля ў Філядэльфію (Амэрыка).

На амэрыканскім рынку беларускае рызьлё заваявала сабе добры попыт і збыт. З Амэрыкі атрымліваюцца патрабаваньні на розныя гатункі рызьля.

Экспарт цыбулі і часнаку.

Белдзяржгандаль бліжэйшымі днямі распачынае экспарт цыбулі і часнаку. Першыя партыі гэтага тавару накіроўваюцца з Гомельскага раёну ў Нямеччыну (Кёнігсберг).

Марынаваныя грыбы на італьянскім рынку.

Белдзяржгандаль распачаў ужо марынаваць грыбы. Дзяржгандаль БССР заправаў вялікую партыю марынаваных грыбоў адной італьянскай фірме.

У бліжэйшы час пачнецца паступовая адпраўка гэтага тавару.

Культурныя навіны.

Манэта з часоў заваяваньня Юдэі.

БДМ набыў вельмі рэдкія старажытныя манэты: адна з часоў сырыйскага цара Анціёха 4 Эпіфана, які вёў барацьбу з Юдэяй, другая манэта была выпушчана рымскім імператарам Вэспесіянам з прычыны заваяваньня Юдэі. Апошняя манэта мае з аднаго боку вобраз Вэспесіяна, на другім баку манэты выбіта пальма, рымскі рыцар і жанчына ў самоце, якая выяўляе заваяваную Юдэю. Тут-жа на латыні надпіс «Judaea Capta» (Канец Юдэі).

Бляха 17 стагодзьдзя.

БДМ атрымаў ад адной з Менскіх сінагог вялізарную бронзавую талерку 17 стагодзьдзя з дужа цікавай гравюраю. На дно талеркі выбіта ўрамэнія прынясеньня ў афіру Ісака, вобраз якога адзеты з голеным тварам і доўгімі пляхецкімі вусамі.

Талерка мае ў дыяметры да 80 см. і дапасавана да вешаньня на сьцяну, як рэфлектар да хавукальных сьвечак.

Раскопкі на Банцараўшчыне.

Пры раскопцы Банцараўскага гарадзішча археалёг Дубінскі летась знайшоў паміж іншым гаршкі з паленым зернем.

Сёлета, коштам БДМ, вядуцца далейшыя дасьледваньні Банцараўскага гарадзішча. Знойдзена зараз на каменнай пляцоўцы маса паленых зярнят, косьці, прылады, шмат бронзавай аздобы, прасьніцы ўсякія, якія да гэтага часу не сустракаліся ў інш. мясцох. На гэтым гарадзішчы вымулена тры культуры старажытнага часу, з якіх апошняя адносіцца да культуры прыняесьня афір, аб чым і сьведчыць спаленьне збожжа.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 27-IX-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—75, куп. 4—73.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—11,5, куп. 5—09,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06,5 куп. 5—04,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,29, куп. 25—19.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121, 50, куп. 119,50.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 103—90, куп. 103—85.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—43,5 куп. 25—38,5.

Менскі дзень.

— 7000 пуд. прэмы выдзеліў сакатузны камітэт ВСНГ СССР на 1928-29 год для БССР.

— Сэсія савету Белкаапсаюзу склікаецца на 13-га кастрычніка ў Менску. На сэсіі будуць абгаворвацца пытаньні аб забясьпечаньні спажывецкай кааперацыі прам таварамі на 1928-29 год, аб перавыбарчай кампаніі, аб капітальным будаўніцтве і г. д.

— 15400 тон сена будзе загатоўлена ў БССР на 1928-29 г. Загатоўкі сена будуць весьці Белсельсаюз, Саюзхлеб і Белсельтрэст.

— 50 вагонаў вотрубей будзе завезена ў БССР у верасьні месяцы. Гэта колькасьць вотрубей пойдзе для забясьпечаньня малочных арцеляў і сельска-гаспадарчых калектываў.

— 6180 тон касьцей пастаноўлена загатовіць па БССР на 1928-29 год.

Загатоўкі касьцей будзе вясьці Управа Дзяржгандалю БССР, Ленінградзі жырсындыкат і Белкаапсаюз.

— Вечар, прысьвечаны юбілею Л. Н. Талстога, адбыўся ўчора, 26-га верасьня, у клюбе Савгандальслужачых. На вечары былі зроблены даклады аб літаратурнай дзейнасьці юбіляра.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. «Буша дэр Вандэрэр» Ю. Бюдах. Дзіцячыя казкі. Цана 16 кап.
(На яўрэйскай мове).

2. „Майн Кілдэле" Ю. Бюдах. Дзіцячыя казкі. Цана 16 кап.
(На яўрэйскай мове.)

3. «Революция и Культура» № 17. Стар. 80, цана 50 кап.
Выданьне газ. «Правда» Масква.

4. «Международная Жизнь» № 8. Стар. 91, цана 1 руб. 25 кап.
Выданьне Народнага Камісарыяту па Замежных Справах. Масква.

Апавяшчэньні.

КУТОК ВУЧОНЫХ.

У пятніцу, 28-9 а 9 г. увечары арганізацыйны сход запісаўшыхся ў гурткі па вывучэньні ангельскай і нямецкай мовы.

Яўка абавязкова.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня а 8 гадз. увечары адбудзецца сход шэфупаўнаважаных устаноў, групомаў і мясцоваму шэфтаварыства Працасьветы. Будзе заслухана справаздача аб шэфпрацы ўпаўнаважанага 2 групкому.

Прысутнасьць усіх шэфупаўнаважаных абавязкова.

—Сёньня, 27 9, кал. артыстаў расейскай драмы будзе пастаўлена п'еса Біль-Белацэрковўскага—«Луна слева» у 4 дзеях, 11 карцінах. Пастаноўка рэжыс. Літвінава. Пачатак а 9 гадз. ув.

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Ад аўторка, 25 верасьня, народны артыст рэспублікі І. М. МАСКВІН — у мастацкай кардіне — „НАРАДЗІУСЯ ЧАЛАВЕК".
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Ад аўторка, 25 верасьня, выключная камэдыя „ГЭТА МОЙ ЖАНІХ" вясёлая камэдыя ў 7 частках. У галоўнай ролі Оссі Асвальд. З сэансы: пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. ○ Каса адчынена ад 6 гадз.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Ад аўторка, 25 верасьня, — падвойная грандыёзная праграма — 2 баявікі ў адзін сэанс 2 Нямецкая мастацкая пастаноўка I. „АБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ" у 7 частках. З удзелам вядомай акторкі Марыі Якабіні. II. „ЗЬНІМАК НА ПЛЯЖЫ" трукавы фільм у 6 частках з удзелам вядомага Рычарда Толмэджа. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Сучасны бытавы фільм „СТАРАНА ЛЯСНАЯ".

УСТУПНЫ БАЛЯНС

ФАБРЫКІ „ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА"

НА 1 КАСТРЫЧНІКА 1927 ГОДУ.

АКТЫЎ.

1. Маемасьць	623936—49	
2. Запаснае абсталяваньне	27331—24	
3. Нясконч. пабудовы	2194—97	
4. Нясконч. капіт. рамонт	15492—11	668954—81
5. Матар'ялы		197877—08
6. Нясконч. нарыхтаваньні		510—90
7. „ вытворчасьць		8062—26
8. Паўфабрыкаты		151387—83
9. Гатовыя вырабы		23085—97
10. Грашовыя сродкі		69340—64
11. Вэксалі і дакум. да атрыманьня:		
1) Вэкс. ў партфэлі	121684—21	
2) Дакум. на інкасо	67039—76	
3) Вэкс. ў вучоце	99115—98	287839—95
12. Падсправаздачн. сумы		2628—84
13. Дэбіторы:		
1) Рабочыя і служ.	2821—50	
2) Дастаўнікі	25066—32	
3) Пакупнікі	62328—92	
4) Розныя дэбіторы	6387—80	
5) Няпэўныя дэбіторы	3011—44	99615—98
14. Выдаткі б. году		8587 —
БАЛЯНС		1517891—26

ПАСЫЎ.

I. Капіталы:		
1. Статутны	830903—09	
2. Амартызацыйны	70394—76	901297—85
II. Фонды:		
1. Фабр (свабодны астат)		15335—41
III. Рэзэрвы:		
1. Рэзэрв няпэўных даўгоў		3011—44
IУ. Пазыкі, ссуды і крэдыты:		
1. Ссуды НКПБ	20000 —	
2. СНКБ	40000 —	60000 —
У. Вэксалі выдадзеныя		95702—25
УІ. Банкі па вучоту вэксалёў		99115—98
УП. Крэдыторы.		
1. Рабочыя і служачыя	18367—34	
2. Дастаўп. па адчыненых рахунках	21089—78	
3. Пакупнік. (авансы)	4250—87	
4. Крэдыторы розныя	18562—97	
5. ЕКО	272119—22	
6. НКФ на прыбытк. падат.	9038—15	343428—33
БАЛЯНС		1517891—26

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ АРТЫКУЛЫ.

1. Дэбіторы па забясьпечаных вэксал.	42453—62	Выдадзеныя забясьпечаныя вэксалі	42453—62
БАЛЯНС	1560344—88	БАЛЯНС	1560344—88

Дырэктар ф-кі ЦЕШАЎ.

Бухгальтар ЭЙДЗІНАЎ.

Гэты балянс зацьверджан Прэзыдыумам ВСНГ БССР 3-IX г. г. (прат. № 23) і Кантрольна-Фін. Кіраўн. ВСНГ БССР дазваляецца да абвяшчэньня ў друку.

Нач. Кантрольна-Фін. Кіраўніцтва ПАГОСКІ.

21-IX-1928 г.

БІБЛІАГРАФІЯ.

СТАТЫСТЫЧНЫ ШТОГОДНІК 1925-26 г.

Выд. ЦСУ БССР. Менск, 1928 г. XII+527 стар.

Толькі што выказаныя заўвагі маюць зразумела, зусім другарадное значэньне ў адносіне да Штогодніка, аднак, пры карыстаньні ім як практыкамі, так і вучонымі і навуковымі дасьледчыкамі яны бясспрэчна маюць некаторае значэньне.

Пры бегглым агляде зусім немагчыма выявіць, у якой меры статыстычныя даныя Штогодніка зьяўляюцца дакладнымі і ў якой меры яны вытрымліваюць праверку ўнутранага і надворнага кантролю. Для гэтага неабходны больш дакладны прагляд ня толькі лічбовых даных Штогодніка, але і ўважнае параўнаньне іх, а таксама прыцягненьне іншых крыніц.

Тут мы абмяжуемся толькі наступным: у частцы, якая датычыцца сельскай гаспадаркі, наложыць адзначыць адсутнасьць вельмі важных у сучасны момант даных па хлебна-фуражнаму балянсу рэспублікі і параўнаўча слабое асьвятленьне пытаньня аб заработнай плаце сельска-гаспадарчых рабочых. У Штогодніку падаюцца даныя толькі па ўсёй БССР. Пакадана было-б мець даныя на акругах і пры тым на больш дробных відах сельска-гаспадарчых работ; у частцы, адносной да адзелу «Прамысловасьць», можна папікадаваць аб адсутнасьці цэлага шэрагу даных адносна розных галін дробнай і саматужна-рамесьніцкай прамысловасьці. Калі ўзяць пад увагу вельмі істотнае значэньне для БССР яе дробнай, а ў тым ліку саматужнай і рамесьніцкай прамысловасьці, а таксама ваяўнасьць праведзенага ЦСУ ў 1926 г. поўнага вучоту дробнай прамысловасьці на вельмі шырокай праграме, дык пададзеныя ў Штогодніку даныя трэба прызнаць вельмі бяднымі (даныя па акругах аб ліку ўстаноў і занятых асоб). Нарэшце, неабходна дадаць яшчэ наступныя моманты, выкліканыя намянёнымі ў «Прадмове» прычынамі: крыху скарочаны абхват Штогодніка ў параўнаньні з гэткім-жа за 1924-25 г., галоўным чынам, за кошт памяркоўных велічынь, што робіць больш цяжкім карыстаньне ім, і другі яшчэ больш істотны момант, а іменна—сказьненьне выпуску. Амаль у 1928-29 гаспадарчым годзе мы маем толькі даныя за 1925-26 г. Патрэбы плянаваньня народнай гаспадаркі, а таксама іншыя штодзённыя патрэбы розных гаспадарчых і адміністрацыйных органаў вымагаюць даных за больш блізкі пэрыяд, а іменна—хутчэйшага выпуску даных за 1926-27 і 1927-28 г.

Ня гледзячы на вышэйдазначаныя дэфэкты, Статыстычны Штогодник можа быць аднесен да ліку тых поўстых і ўсебакова ахапляючых гаспадарчае жыцьцё статыстычных зборнікаў, якія толькі ў апошнія гады пачалі выходзіць у розных частках нашага Саюзу.

А. Арцымовіч.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара
П. ШАСТАКОЎ.

ПАСТАНОВА № 52

НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ГАНДЛЮ БССР.

20 верасьня 1928 г. г. Менск.

Аб устанаўленьні загатоўчых цэн на ільнянае валакно на сэзон 1928-29 г.

На падставе п. п. „м" і «о» 4 арт. Часовага Палажэньня аб Народным Камісарыяце Унутранага Гандлю БССР (Зб. Закон. БССР 1924 г. № 25-26, арт. 227) і пастановы Народнага Камісарыяту Замежнага і Унутранага Гандлю СССР за 9 жніўня 1928 г. і ў мэтах стымулявання разьвіцьця ільнаводства і павялічэньня паступленьня ільнавалакна на рынак за лік скарачэньня асаджаньня яго ў сялянскіх гаспадарках, Народны Камісарыят Гандлю БССР

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць на тэрыторыі БССР наступныя загатоўчыя цэны на ільнянае валакно ў кап. за кгр.:

ЛЁН-СЛАНЕЦ.

Група.	Сорт.	Ср. №	Цана.
УІ	ВФ	18	70
	Ф	16	65
	О	14	58
	І	12	53
	II	10	45
	III	8	39
	Іу	6	30
	Бр.	4	23

ЛЁН СЛАНОВЫ СЫРЭЦ.

Група.	Сорт.	Ср. №	Цана сырца. 1 гр.	II гр.
УІ	ВО	16	47	44
	О	14	42	40
	І	12	36	33
	II	10	30	28
	III	8	24	22
	Іу	6	17	15

КУДЗЕЛЯ.

Група.	Ср. №	Цана.
III	16	50
	14	47
	12	43
	10	39
	8	33
	6	27
	4	22

ЛЁН-МАЧАНЕЦ.

Група.	Сорт.	Ср. №	Цана.
III	Ф	17	64
	О	14	58
	І	12	53
	II	10	43
	III	8	37
	Іу	6	28
	Бр.	4	22

ЛЁН-МАЧАНЕЦ.

Група	Сорт	Ср. №	Цана
Іу	Ф	15	61
	О	13	55
	І	11	47
	II	9	40
	III	7	31
	Іу	5	24
	Бр.	3	17

ЛЁН СЫРЭЦ МАЧАНЕЦ

Група	Сорт	Цана
III	О	30
	1	25
	II	22
	III	17
	Іу	13

ЛЁН ПАЛУТРОП. МАЧАНЕЦ

Сорт	Ср. №	Цана
Ф	16	54
О	13	48
І	11	44
II	9	38
III	7	31
Іу	5	23
Бр.	3	17

2. У радыусе 10 вёрст, які мяжуецца з сумежнымі з Беларусьсю губэрніямі РСФСР (Пскоўская і Смаленская), дзе цэны, у параўнаньні з мінулым годам, павышаны ў меншым разьмеры, устанавіць загатоўчыя цэны на лёнсланец: № 18—68 кап., № 16—64 кап.

3. Новыя цэны ўстаноўлены ф-ка загатоўчы склад, які разьмешчан у раёне 10-цівёрстнага радыусу ад станцыі чыгункі, альбо функцыянуючай прыстані, а ў фабрычнай зоне—ад складу пры фабрыцы.

4. У пунктах, якія разьмешчаны за межамі памянёнага 10-цівёрстнага радыусу, устанавіць дыфэрэнцыраваныя цэны на аснове наступнай скалы скідак з зацьверджаных цэн:

а) У раёне ад 11-ці да 20-цівёрстнага радыусу робіцца скідка ў разьмеры 60 кап. на цэнтнэр.

б) У раёне ад 21 вёрстнага да 30-цівёрстнага радыусу робіцца скідка ў разьмеры 90 кап. на цэнтнэр.

в) У раёне ад 31 вёрстнага да 45 вёрстнага радыусу робіцца скідка ў разьмеры 1 р. 20 кап. на цэнтнэр.

г) У раёне ад 46 вёрстнага радыусу да 60 вёрстнага радыусу робіцца скідка ў разьмеры 1 р. 50 к. на цэнтнэр.

5. Устаноўленыя гэтай пастановай цэны ўведзены ў жыцьцё з 20-га жніўня г. г.

6. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы падлягаюць адказнасьці па арт. 141 Крым. Код. БССР.

Нам. Наркамгандлю БССР БРЫСКІН.

Сэкратар ВЕРАМЕЙЧЫК.

Літбел № 302. 1-я дзяржаўная друкарня